ЧАМУ ТАЎСЦЕЮЦЬ ДЗЕЦІ 8

АФІЦЭР ЖАНОЧАГА РОДУ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

7 САКАВІКА 2024 г. ЧАЦВЕР № 48 (30182)

КАРАТКА

- **Усебеларуская акцыя «Мы — грамадзяне Беларусі!» стартуе 11 сакавіка.**
- Беларускія палярнікі павіншавалі жанчын з 8 Сакавіка.
- **Больш за 2 тысячы работ даслалі на конкурс малюнка «Выбары вачыма дзяцей».**
- У Беларусі актывізаваліся кляшчы.
- **ММЗ пачне сёлета зборку матацыклетных рухавікоў на плошчах «МотаВелаЗавода».**
- Мінкультуры аб'явіла конкурс на найлепшае афармленне інтэр'ераў установ дадатковай адукацыі.
- **У Мінску запрацавалі 185 адкрытых пляцовак па продажы вясновых кветак. У параўнанні з мінулым годам колькасць гандлёвых пунктаў зменшылася — тады ў спісе значылася каля 200 адрасоў.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Раман Галоўчанка, прэм'ер-міністр:

«Нам удалося адаптаваць эканоміку да дзейнасці ва ўмовах незаконных і жорсткіх абмежаванняў, перафарматаваць работу на экспартным кірунку. Па выніках 2023 года аб'ёмы паставак у дружалюбныя краіны перавысілі страты экспарту на заходніх, украінскім і іншых рынках на $1,8 млрд. Гэты год будзе не менш напружаным, бо нам трэба не проста захаваць бягучы ўзровень, а выканаць пастаўленую Прэзідэнтам задачу — дадаць па экспарце тавараў і паслуг 7,6 %. Задача вельмі напружаная».

ВІНШУЕМ, ЛЮБІМЫЯ!

Дарагія суайчыннікі!

З асаблівай цеплынёй шчыра віншую вас з Днём жанчын — пяшчотным вясновым святам.

Жаночая душа — гэта дзіўны свет любові, у якім прыродныя прыгажосць і абаянне спалучаюцца са стваральнай энергіяй мацярынскіх пачуццяў, трапяткім клопатам і працавітасцю.

Не шкадуючы часу і сіл, вы прысвячаеце сябе блізкім і абранай справе, напаўняеце жыццё яркімі эмоцыямі, светлымі надзеямі, утульнасцю і гармоніяй.

Побач з вамі мы, мужчыны, адчуваем упэўненасць у сваіх сілах, адказнасць за мірную будучыню дзяцей і лёс роднай Беларусі.

Нашы дарагія і любімыя, прыміце словы глыбокай удзячнасці за адданасць краіне і ўклад ва ўмацаванне адзінства і стабільнасці ў грамадстве.

Жадаю ўсім моцнага здароўя, дабрабыту і поспехаў у справах. Няхай прыемная атмасфера свята падорыць выдатны настрой і здзяйсненне запаветных жаданняў. Будзьце шчаслівыя!

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Фота Віктара ІВАНЫКАВА.

Дзяніс ЮДЗІЦКІ пятнаццаць гадоў працуе вадзіцелем электрапагрузчыка ў цяплічным камбінаце «Багатырова» агракамбіната «Ждановічы», дзе і вырошчваюць усю гэтую прыгажосць. Ружы ад яго — не толькі жонцы Таццяне і дочкам Аліне і Марыі, але і ўсім нашым чытачкам!

Спажывец

Букет на Восьмага сакавіка

Колькі давядзецца выдаткаваць «на рамантыку»?

Букет на Восьмага сакавіка — даніна традыцыі. І ўсё ж любой жанчыне, нават калі да кветак яна абыякавая (а такіх, насуперак стэрэатыпам, таксама дастаткова), неяк крыўдна было б застацца без букета ў сваё «законнае» свята.

І без падарунка, зразумела. Кветкі сёння задавальненне не таннае і па кошце цалкам цягнуць на самастойны падарунак. Але традыцыя патрабуе, каб букет быў дадаткам да асноўнага «сюрпрызу». І з ёй не паспрачаешся, на тое яна і традыцыя. Такім чынам, высвятляем цэны на кветкі (улічваючы, што непасрэдна да 8 Сакавіка яны змяняюцца).

Анлайн і афлайн

— Паднімуцца цэны абавязкова! — кажа прадавец Ксенія, якая гандлюе кветкамі ў кіёску, размешчаным у пераходзе адной са сталічных станцый метро.

Яна расказвае, што «на кветках» працуе ўжо восем гадоў і рост цэн да 14 лютага і 8 Сакавіка — таксама свайго роду традыцыя.

— Гэта залежыць не ад нас, кветкі перад святамі становяцца даражэй у закупцы ў аптавікоў, — тлумачыць суразмоўніца. — Таму што на святы, у першую чаргу на 8 Сакавіка, попыт на іх заўсёды высокі.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на II квартал 2024 года

ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

ISSN 1990 — 763X

На кантролі

ПАВЕЛІЧЭННЕ ВЫПУСКУ ПРАДУКЦЫІ І ЎЗРОЎНЮ ЛАКАЛІЗАЦЫІ, ЗАДЗЕЙНІЧАННЕ ЎСЁЙ ПЛОШЧЫ

Наталля КАЧАНАВА наведала вытворчую пляцоўку на Партызанскім праспекце ў сталіцы і правяла нараду па эфектыўным выкарыстанні тэрыторыі былога «МотаВелаЗавода»

Наведваючы вытворчую пляцоўку 5 сакавіка 2021 года, Прэзідэнт арыентаваў падысці да гэтай тэрыторыі па-гаспадарску. У сувязі з гэтым былі дадзены даручэнні стварыць на незадзейнічаных плошчах высокатэхналагічныя вытворчасці. Пытанне рэалізацыі інвестыцыйных праектаў на тэрыторыі былога «МотаВелаЗавода» знаходзіцца на кантролі Савета Рэспублікі.

Спікер верхняй палаты парламента, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў г. Мінску неаднойчы наведвала вытворчую пляцоўку, рэгулярна цікавілася ў адказных асоб, на якім этапе знаходзіцца забудова тэрыторыі. Гэтым разам Наталля Качанава асабіста азнаёмілася з ходам работ у карпусах, пракантралявала, наколькі эфектыўна выкарыстоўваюцца вытворчыя плошчы.

Дырэктар ТАА «МотаВелаЗавод» Сяргей МАНЬКО далажыў Старшыні Савета Рэспублікі аб ходзе рэалізацыі інвестыцыйнага праекта на тэрыторыі «МотаВелаЗавода» і лакалізацыі камплектуючых для мота- і велатэхнікі. Пры гэтым асноўны акцэнт у дакладзе быў зроблены на галоўнае патрабаванне кіраўніка дзяржавы наконт гэтага прадпрыемства, якое заключалася ў неабходнасці захаваць не толькі вытворчасць, але і кампетэнцыі.

У размове з журналістамі дырэктар «МотаВелаЗавода» расказаў, што ў цяперашні момант на тэрыторыі завода ажыццяўляецца рэканструкцыя памяшканняў. «Адначасова праводзіцца мадэрнізацыя «МотаВелаЗавода», закуплена новае абсталяванне, якое зманціравана і праходзіць пусканаладачныя работы, — дадаў ён. — У працэсе пусканаладачных работ ужо атрыманы новыя веласіпедныя мадэлі. Дзякуючы інавацыйным рашэнням канструктарскага аддзела за 2023 год былі атрыманы два электрасамакаты. Яны ўжо выпушчаны, сертыфікаваны. За бягучы перыяд 2024 года спраектаваны дзве мадэлі электравеласіпедаў. На цяперашні момант яны праходзяць сертыфікацыйныя мерапрыемствы».

Сяргей Манько адзначыў, што выконваецца і даручэнне Прэзідэнта па вытворчасці беларускіх камплектуючых. «Да 2029 года ўзровень лакалізацыі вытворчасці складзе не менш як 50 %, — заўважыў ён. — Лакалізацыя камплектуючых дазволіць заводу стаць больш незалежным».

Наталля Качанава азнаёмілася з выставай мота- і велатэхнікі, імпартазамяшчальнай прадукцыі і камплектуючых для яе вытворчасці. Пачаўшы нараду, Старшыня Савета Рэспублікі агучыла яе ключавую мэту — кантроль выканання даручэнняў кіраўніка дзяржавы, якія былі дадзены пры наведванні гэтага прадпрыемства.

«Першае — неабходна павялічыць выпуск прадукцыі і ўзровень лакалізацыі, бо тады гэта была практычна зборка, — звярнула ўвагу спікер. — Сёння мы бачым, што ўжо самі пачалі выпускаць частку камплектуючых для матацыклаў і веласіпедаў. Таму я папрасіла б далажыць аб узроўні лакалізацыі, каб мы зафіксавалі, што зроблена на сёння. Другое пытанне немалаважнае — адкрыццё вытворчасцяў і задзейнічанне ўсёй тэрыторыі. Мы ўбачылі, што даволі шмат зроблена, але разам з тым ёсць адставанне ад тых тэрмінаў, якія былі вызначаны раней».

Старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ далажыў аб рэалізацыі інвестыцыйнага праекта «Рэканструкцыя тэрыторыі па праспекце Партызанскім, 8 у г. Мінску». Ён расказаў, што ўсе карпусы, якія будуць функцыянаваць, ужо ўзведзены. У бягучы момант работы вядуцца на 20 з 28 корпусоў. Як і планавалася, у іх размесцяцца высокатэхналагічныя вытворчасці. «Да канца 2025 года ўсе работы будуць завершаны, на два гады раней, чым ставіў задачу Прэзідэнт», — адзначыў старшыня Мінгарвыканкама.

Генеральны дырэктар ААТ «Кіруючая кампанія холдынга «Мінскі маторны завод» Аляксандр БАТВІННІК нагадаў, што кіраўніком дзяржавы пастаўлена важная задача ў частцы больш глыбокай лакалізацыі вытворчасці матацыклаў у Рэспубліцы Беларусь. «Адным з элементаў матацыкла з'яўляецца рухавік унутранага згарання — фактычна гэта сілавая ўстаноўка, якая складаецца са стандартнага бензінавага рухавіка і каробкі перадач, — паведаміў ён. — У рамках сумеснага плана мерапрыемстваў мы плануем паэтапную лакалізацыю вытворчасці матацыклетнага рухавіка ў Рэспубліцы Беларусь».

Плануецца, што зборку пачнуць ажыццяўляць сёлета. Па словах гендырэктара, у рамках гэтай вытворчасці будзе закрыта ўся патрэба «МотаВелаЗавода» ў матацыклетных рухавіках.

Вераніка КАНЮТА.
Фота БелТА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Авіякампанія Lufthansa адменіць каля тысячы рэйсаў

Каля тысячы рэйсаў будуць адменены 7 і 8 сакавіка з-за папераджальнай двухдзённай забастоўкі супрацоўнікаў наземных службаў найбуйнейшай германскай авіякампаніі Lufthansa. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на тэлеканал NTV. Адзначаецца, што авіякампанія плануе адмяніць 80—90 працэнтаў сваіх рэйсаў. Планы прыкладна 100 тысяч пасажыраў будуць парушаны. Да забастоўкі заклікаў прафсаюз сферы паслуг Verdi. Падставай для закліку да стачкі сталі калектыўныя перагаворы ў дачыненні да прыкладна 25 тысяч наземных супрацоўнікаў Lufthansa, Lufthansa Technik і Lufthansa Cargo. Verdi патрабуе павышэння зарплаты наземнаму персаналу на 12,5 працэнта. Паводле даных прафсаюза, на папярэдняй сустрэчы працадаўцамі была вылучана неадэкватная прапанова. Наступны раўнд перагавораў адбудзецца 13 і 14 сакавіка.

Паліцыя Ганконга затрымала групоўку за транспарціроўку какаіну на $12,8 млн

Наркотыкі былі знойдзены ў патаемным адсеку транспартнага кантэйнера і ў двух аўтамабілях. Аб гэтым паведаміла выданне South China Morning Post. Агент бюро па барацьбе з наркотыкамі заявіў, што выяўленне партыі наркатычных рэчываў вагой 95 кілаграмаў стала вынікам планамернай работы ведамства, у выніку якой быў праведзены арышт членаў злачыннага сіндыката. Прадстаўнік бюро, расказваючы дэталі захопу, удакладніў, што ў двух кінутых аўтамабілях было знойдзена 20 кг падазронага рэчыва. Падчас спецаперацыі паліцэйскія арыштавалі дзьвюх мужчын ва ўзросце 23 і 24 гадоў. Высветлілася, што два транспартныя сродкі выкарыстоўваліся ў якасці мабільных складскіх памяшканняў наркагандляроў. Далейшыя расследаванні прывялі да таго, што паліцэйскія выявілі яшчэ 75 кг таго ж рэчыва ў кантэйнеры, які выкарыстоўваўся ў якасці офіса ў раёне Лунг Юк Таў у Фанлінгу. Ахоўнікі правапарадку арыштавалі яшчэ некалькіх чалавек па падазрэнні ў кантрабандзе.

У джунглях Папуа — Новай Гвінеі знайшлі самалёт, зніклы 80 гадоў таму



Самалёт марской пяхоты ЗША часоў Другой сусветнай вайны быў знойдзены праз 80 гадоў пасля знікнення ў джунглях Папуа — Новай Гвінеі, паведаміла Daily Mail. Абломкі самалёта Douglas SBD Dauntless знайшлі мясцовыя жыхары. Яны зрабілі яго здымкі і адправілі іх у пасольства ЗША. Фатаграфіі серыйнага нумара супалі з нумарам самалёта, які разбіўся 14 студзеня 1944 года. Побач з абломкамі былі знойдзены чалавечыя астанкі. Каб вызначыць, каму яны належаць, Міністэрства абароны ЗША накіравала на месца следчых. Мясцовыя жыхары мэтанакіравана шукалі ў джунглях самалёт. Яны чулі аб крушэнні ад старэйшага пакалення і вырашылі адправіцца на пошукі. Група ведала, што авіякатастрофа адбылася ў горнай частцы джунгляў. Каманда вяла пошук на працягу двух месяцаў, перш чым выявіла зніклы самалёт.

Па сутнасці

ВЫБАРЫ НАРОДНАГА АДЗІНСТВА

Зусім хутка гэта стане гісторыяй, што напісана не пад чужую дыктоўку, не за заморскія грошы, а нашым народам. Менавіта гэты адзіны дзень галасавання стаў самым народным, самым нашым. Чаму так? Давайце разбірацца.

Выбары паказалі, што наша Радзіма прыйшла ў прытомнасць ад заморскага віруса «каляровых рэвалюцый» і імпартных ідэй самазнішчэння сваёй дзяржаўнасці, у выніку — саміх сябе. А ўвага да нашых выбараў была пільнай. Ворагі паціралі рукі, разведкі суседніх недружалюбных краін ладзілі правакацыі, палітычныя лузеры зрабілі ўсё, каб справакаваць грамадскую незадаволенасць. Але гэта прайшло міма нас. Так, мы чыталі і глядзелі. Хтосьці палохаўся ад такой інфармацыі, хтосьці не хацеў верыць, нават жартаваў. Лёгка іранізаваць з тэракту, які не адбыўся, бо тыя, каму належыць гэта рабіць, яго прадухілілі. Мы шмат чаго не ведаем. Да многага ставімся як да належнага. Гэта і ёсць славутая характэрная беларуская стабільнасць. Можна не згаджацца і спрачацца. Але менавіта за яе беларусы і прагаласавалі. Дзеля гэтага прыйшлі на выбары. А ўжо потым выбіралі персоны і партыі.

Беларусы ўсё ўбачылі, усё зразумелі. Большасць беларусаў! Адзіны дзень галасавання не толькі дазволіў сэканоміць значныя матэрыяльныя рэсурсы. Выканана галоўная місія — на справе прадэманстраваць адзінства народа. Гэта вымяраецца не толькі ў лічбах і працэнтах тых, хто прагаласаваў, — атмасфера 25 лютага перадала адзіны дух. Нас можна павіншаваць усіх: з паспяховым і элегантным правядзеннем выбараў, з кансалідацыяй нацыі. Адзіны дзень галасавання стаў днём яднання краіны і нашага грамадства. На ўчасткі прыйшлі або паклікалі да сябе дамоў прадстаўнікоў выбарчых камісій усе, хто неабыякавы да развіцця краіны. Што гэта, калі не грамадзянская супольнасць?

Па-першае, беларусы асвоілі азы медыйнай гігіены. Гэта першасная прафілактыка ад вірусаў «каляровых рэвалюцый». Па-другое, мы ж грамадства добрага сэрца і высокага інтэлекту. Разабраліся. За чатыры гады пара ўжо. «Неверагоднасць» вычарпала сябе. А свята засталося. У нас выбары не «майданутыя», а з песнямі і танцамі. Ды яшчэ і далікатэсамі. А тым, у каго гэта выклікае ўсмешку, скажу прама: лепш прысмакі ад спажыўкааперацыі і фермераў, чым «печыва» Дзярждэпа. Часам не варта і каштаваць, каб зразумець — атрута.

Беларусы выбралі менавіта нашу Беларусь. Беларусь, якую ў 2020 годзе відавочна імкнуліся разбурыць, а датуль намагаліся знішчыць праз фонды, культуру, сэнсы. Не выйшла. Менавіта таму «з'ехала» пэўная частка грамадства. Справа не ў таталітарызме. Справа ў нязручнасці... Справа ў тым, што чорт заўжды бяжыць ад ладану. Вось галоўная прычына «неверагоднай эміграцыі». Краіна не тая: сацыяльна арыентаваная, а не рыначная, традыцыйная, а не модна-гендарная, з класічным грамадствам, а не «лібераламі-касмапалітамі». Абсалютная большасць беларусаў паказала: мы выбіраем менавіта нашу краіну, такую, якая яна цяпер.

Роля парламентарызму ўзмацняецца: у Авальнай зале павінны выпрацоўвацца сэнсы і трэнды, закладваць іх у заканадаўчы базіс. Палітра народаўладдзя становіцца шырэйшай і ярчэйшай. З'явіўся канстытуцыйны орган — Усебеларускі народны сход — цяпер, напэўна, самая папулярная абрэвіятура ў беларускім грамадстве. УНС — гэта грамадска-палітычная страхоўка.

Прэзідэнт нацэльвае пастаянна: дакладна бачыць рэальную сітуацыю, адчуваць запыты грамадства. Задача мясцовых выбраннікаў — чуць людзей, каб не было ашалелай вуліцы. Цяпер нам трэба не падвесці Прэзідэнта. Іспыт адзіным днём галасавання вытрымалі. Усе разам: дзяржаўныя інстытуты і грамадства. Менавіта цяпер як ніколі вельмі важны адзіны дух для дзяржавы і дакладная вертыкаль улады. Што і паказалі мінулыя выбары. Беларускае грамадства хвалюе захаванне нашай мадэлі развіцця і далейшая палітычная сітуацыя ў краіне. Мы прагаласавалі за дзейны курс дзяржавы. За яго выразную персаніфікацыю. Калі хочаце — за кожнага асобнага дэпутата, але ўсе разам — за Першага. А ён падводзіць не ўмее. Не для таго будаваў краіну, каб яна разбурылася на яго вачах. Таму служэнне працягваецца.

Яўген ПУСТАВОЙ.

У ДОБРЫ ЗОРНЫ ШЛЯХ!

Беларускіх касманаўтаў праводзілі на Байканур

У Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў у падмаскоўным Зорным гарадку ўчора было людна. Тут сабраліся моладзь, старэйшыя людзі і нават дзеці. Нагода самая што ні на ёсць урачыстая: на касмадром Байканур праводзілі асноўны і дубліруючы экіпажы 21-й экспедыцыі наведвання Міжнароднай касмічнай станцыі. Сярод іх — і нашы суайчыннікі Марына Васілеўская і Анастасія Лянкова, да якіх таксама прыехалі самыя блізкія і родныя людзі. Слёз развітання не было. Толькі радасць і гордасць за дзяўчат, якім выпаў гонар прадстаўляць нашу краіну ў бязмежнай касмічнай прасторы. Да якога, дарэчы кажучы, першаму касманаўту ў гісторыі суверэннай Беларусі застаўся літаральна адзін крок — двухтыднёвая перадстартавая падрыхтоўка. Карэспандэнты БелТА сталі сведкамі гэтага кранальнага моманту і гатовы расказаць, што адчувалі сваякі беларусак, праводзячы дачок на Байканур.

«Гатовы да палёту і выканаем усё на 100 %, нават лепш»

Зразумела, перш чым адправіць экіпажы на касмадром, ім далі магчымасць правесці час з сем'ямі. У Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў для іх прыгатавалі ўрачысты сняданак, падчас якога ў членаў экіпажаў была магчымасць пагутарыць з самымі блізкімі людзьмі, паслухаць іх словы на дарогу і падбадзёрванне.

«Кіраўніцтва пажадала нам штатнай работы. Было прыемна, што вельмі шмат людзей сабраліся на ўрачысты сняданак перад адпраўленнем на Байканур. Мы выказалі ўсім словы падзякі за праведзеную падрыхтоўку і такія душэўныя праводзіны», — расказаў **журналістам камандзір асноўнага экіпажа, касманаўт «Раскосмасу» Алег НАВІЦКІ.**

«Кіраўніцтва Цэнтра падрыхтоўкі касманаўтаў пажадала нам удачы, поспеху, каб асноўны экіпаж вылецеў па плане. У сваю чаргу, мы гатовы да палёту і выканаем усё на 100 працэнтаў, нават лепш. З такім экіпажам — толькі ў космас», — падтрымала камандзіра Марына Васілеўская.

Алег Навіцкі таксама адзначыў, што ў кампаніі Марыны Васілеўскай і астранаўта НАСА адчувае сябе ўпэўнена. «Экіпаж вельмі надзейны і вельмі прыгожы», — дадаў ён. Напярэдадні Міжнароднага жаночага дня Алег Навіцкі пажадаў цудоўнай палове чалавецтва такога ж настрою, як і ў дзяўчат экіпажа ЭП-21.

Астранаўт НАСА Трэйсі Дайсан пры гэтым адзначыла, што вельмі ганарыцца тым, што прайшла падрыхтоўку ў ЦПК імя Ю. А. Гагарына і стала часткай экіпажа. «Тут арганізавана цудоўная падрыхтоўка касманаўтаў і астранаўтаў. Я рада, што прадстаўляю НАСА ў гэтай місіі», — сказала астранаўт.

«Была мара — узляцець вышэй за неба»

У журналістаў была магчымасць паразмаўляць з роднымі і блізкімі Марыны Васілеўскай і Анастасіі Лянковай. Бацька Марыны Віталь Васілеўскі распавёў, што дачка яшчэ падчас работы бортправадніцай марыла пераадолець вышыню 10 тысяч метраў.

Бацька Марыны Васілеўскай таксама расказаў, ці лёгка было адпусціць дачку ў космас: «Яна гэтага захацела, значыць, трэба адпусціць. У яе была мара — узляцець вышэй за неба яшчэ падчас работы бортправадніцай «Белавія». І вось яна дасягнула сваёй мэты». Па словах Віталя Васілеўскага, дачка да апошняга не казала яму аб тым, што плануе стаць удзельніцай касмічнага палёту. «Калі даведаліся, то хваляваліся, перажывалі. А зараз толькі радасць», — сказаў на заканчэнне бацька Марыны Васілеўскай.

Анастасія Лянкова ўваходзіць у склад дубліруючага экіпажа разам з камандзірам, касманаўтам «Раскосмасу» Іванам Вагнерам і астранаўтам НАСА Дональдам Петытам. Разам з тым Анастасія запэўніває: пры неабходнасці дубліруючы экіпаж гатовы падмяніць асноўны. Пра космас дзяўчына марыла зусім з дзяцінства і маленькімі, але ўпэўненымі крокамі рухалася да мары.

«Калі я даведалася, што дачка можа паляцець у космас, то адчула хваляванне. Але ўсяго, чаго дачка хацела дабіцца, яна дабівалася сама — так бы мовіць, маленькімі крокамі. І для маці гэта вялікае шчасце — бачыць, як дзіця набліжаецца да сваёй мэты. Мне гэта вельмі радасна. Яна з дзяцінства марыла аб космасе, купляла часопісы па гэтай тэме», — сказала маці Анастасіі Наталля Лянкова.

Яна дадала, што рэгулярна стэлефаноўвалася з дачкой, цікавілася, як праходзіць яе падрыхтоўка. «У якасці талісмана я перадала дачцэ цацку Нязнайку, якую яна ўзяла на Байканур», — адзначыла Наталля Лянкова.

На касмадроме экіпажы чакае перадстартавая двухтыднёвая падрыхтоўка. А далей — толькі космас: да без усялякіх перабольшанняў знакавага і гістарычнага моманту для нашай краіны засталося зусім няшмат.

Фота БелТА.

З нагоды

...З ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫЯЙ, ЗАНЯТАЯ Ў БЮДЖЭТНАЙ СФЕРЫ, МАЕ ДВАІХ ДЗЯЦЕЙ

У Мінпрацы расказалі пра тыповы партрэт беларускі

Сярэднестатыстычны партрэт беларускі — жанчына, якая мае вышэйшую адукацыю, працуе ў сферы аховы здароўя ці адукацыі, знаходзіцца ў шлюбе і мае дваіх дзяцей. Узрост нараджэння дзіцяці, дарэчы, сёння складае больш за 30 гадоў, першага дзіцяці — больш за 27 гадоў. Напярэдадні 8 Сакавіка спецыялісты расказалі пра беларускіх жанчын і дзяржаўную падтрымку, якая ім аказваецца.

Паводле інфармацыі **намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Валерыя КАВАЛЬКОВА,** сёння ў Беларусі жыве больш за пяць мільёнаў жанчын — яны складаюць большую частку насельніцтва. З жанчын працаздольнага ўзросту 85 % заняты ў эканоміцы. І працуюць у традыцыйна жаночых галінах: адукацыі і ахове здароўя.

— Эканамічны статус жанчын расце з году ў год. У нас 40 % жанчын маюць вышэйшую адукацыю, амаль 30 % — сярэднюю спецыяльную. І ўзровень адукаванасці жанчын вышэйшы, чым мужчын, — адзначыў Валерый Кавалькоў.

Жанчыны валодаюць не толькі прафесійнымі, але і дзелавымі якасцямі і шырока ўдзельнічаюць у прыняцці рашэнняў. У самым працаздольным ўзросце, ад 20 да 50 гадоў, палова кіраўнікоў — жанчыны. Больш за 30 % жанчын з'яўляюцца дэпутатамі і членамі Нацыянальнага сходу.

— Калі ў Еўропе кажуць, што трэба ўводзіць кватаванне, каб жанчына магла выходзіць на ўзровень прыняцця рашэнняў, для беларускіх жанчын гэта не характэрна. Наша жанчына хутка паляціць у космас. Гэта яшчэ раз пацвярджае іх шматграннасць, прадстаўленую ва ўсіх галінах, — падзяліўся Валерый Кавалькоў

Робіцца шмат для падтрымкі жанчын на рынку працы і ў прадпрымальніцкай ініцыятыве. Важна стварыць камфортныя ўмовы для прафесійнай дзейнасці і сям'і.

— Многае зроблена. Улічваючы асаблівую ролю жанчыны ў грамадстве, у заканадаўстве ёсць шэраг палажэнняў, якія ствараюць спрыяльныя ўмовы для работы і прафесійнай рэалізацыі. Гэта магчымасць працаваць няпоўны дзень ці па гнуткім графіку, створаны ўмовы для дыстанцыйнай працы — дома і ў офісе, гэта замацавана ў новым Працоўным кодэксе, цэлая глава рэгулюе дадзеныя віды работ, якія можна чаргаваць, — пералічыў намеснік міністра.

Асаблівая ўвага шматдзетным сем'ям, а таксама сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. У іх ёсць магчымасць узяць адзін вольны ад работы дзень у тыдзень, ён аплачваецца. Сёння з'явілася альтэрнатыва: адзін вольны дзень можна замяніць скарачэннем працоўнага дня на адну гадзіну, што таксама аплачваецца.

— Дзяржава ў поўнай меры выконвае свае абавязкі па падтрымцы сем'яў з дзецьмі. Гэта дапамога пры нараджэнні дзіцяці, яго выхаванні, трохгадовы водпуск, які атрымлівае жанчына, каб даглядаць дзіця. Выдаткоўваюцца значныя сродкі на падтрымку сем'яў з дзецьмі. На дапамогі ў 2024 годзе запланавана 3,4 мільярда рублёў, — дадаў Валерый Кавалькоў.

Міністэрства працы і сацыяльнай абароны праводзіць пастаянную работу па павышэнні прэстыжу бацькоўства. Уведзены спецыяльны водпуск для бацькі 14 каляндарных дзён, які можа быць прадстаўлены цягам шасці месяцаў пасля нараджэння дзіця, і гэта норма з'яўляецца абавязковай для наймальнікаў. Устаноўлены святочны дзень — Дзень бацькі, які падкрэслівае значнасць ролі мужчыны ў сям'і. Яшчэ адна нагода для мужчын ганарыцца званнем таты і працягваць свой род.

Жанчыны-маці, якія нарадзілі і выхавалі пяць і больш дзяцей, прадстаўляюцца да высокай дзяржаўнай узнагароды — ордэна Маці. Толькі летась ім было ўзнагароджана 669 жанчын. Не застаюцца без увагі жанчыны-маці, калі яны выходзяць на пенсію. Шматдзетныя маці маюць права на заслужаны водпуск на пяць гадоў раней, калі яны нарадзілі пяць і больш дзяцей. Калі ў жанчыны дзевяць дзяцей і яны дастойна выхаваны, жанчыне прызначаецца пенсія за асаблівыя заслугі перад Беларуссю.

— Мы пастаянна актуалізуем запатрабаванасць эфектыўных мер, прапрацоўваем іх, і, канешне, у ліку найбліжэйшых задач — узмацненне адраснасці дапамог, павышэнне эфектыўнасці выкарыстання бюджэтных сродкаў. Краіна ганарыцца нашымі жанчынамі, дзякуючы якім непарушнымі застаюцца такія каштоўнасці, як сям'я, дом, дзеці. Менавіта гэтыя каштоўнасці забяспечваюць сувязь пакаленняў і гарантуюць будучыню нашай дзяржавы, — рэзюмаваў Валерый Кавалькоў.

Алена КРАВЕЦ.

Букет на Восьмага сакавіка

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прадаўцы спадзяюцца, што падаражэюць кветачкі не занадта моцна: і без гэтага яны дарагія, што істотна адбіваецца на пакупніцкай цікавасці. Суразмоўніца кажа, што на 8 Сакавіка рознічная нацэнка не павышаецца: зарабляюць прадаўцы толькі на павелічэнні продажаў.

— Пакуль на цэны можаце нават не глядзець, — раіць Марына, гаспадыня маленькай кветкавай крамы ў будынку аднаго з мінскіх гіпермаркетаў. — Сёння, напрыклад, вось такія ружы па сем рублёў, на 14 лютага былі па 12, а на 8 Сакавіка, спадзяемся, будуць па 13-14, не даражэй. Усё залежыць ад паставак, і калі ў аптавікоў кветкі даражэюць, утрымаць рознічныя кошты, на жаль, у краме магчымасці няма.

Яна зазначае: значна даражэюць менавіта імпартныя кветкі. На кветкі беларускай вытворчасці цэннік узнімаецца не моцна.

У цэлым традыцыйна імпартныя кветкі да жаночага дня кожны год узлятаюць у цане мінімум на 15-30 %, распавялі прадаўцы. Гэта нядзіўна: па статыстыцы (аказваецца, ёсць і такая статыстыка) попыт на «рамантыку» перад «сакральным» для кожнага мужчыны ў нашых шыротах днём павялічваецца ў 25-30 разоў. І, як вынік, калі букет руж «сярэдняй рукі» сёння каштуе 65 рублёў, то пачынаючы з сёмага сакавіка, і асабліва — 8-га з раніцы, рыхтуйцеся выкласці за яго рублёў 80, а тое і 90.

Дарэчы, анлайн ці афлайн вы будзеце набываць букет, не важна: даражэй у Міжнародны жаночы дзень, напярэдадні і адразу пасля яго, кветкі будуць і ў інтэрнэце. Асабліва калі вас цікавіць незвычайны, аўтарскі букет. Так што, мабыць, па кветкі для сваіх жанчын прасцей прыйсці сваімі нагамі.

Купляем беларускае

8 Сакавіка для прадаўцоў кветак — галоўнае свята і, мабыць, самы важны дзень у годзе. У суседняй Расіі падлічылі, што за першы тыдзень сакавіка прадаецца 15 % гадавога аб'ёму кветак. У Беларусі, напэўна, гэты працэнт не меншы (калі не большы). Калісьці, кажа Ксенія, за тыдзень-два ў пачатку вясны (14 лютага і 8 Сакавіка, а таксама яшчэ некалькі дзён да і пасля гэтых дат) можна было «нагандляваць» на машыну. Сёння

пакупнік ужо не той: часцяком выбар робіць на карысць бюджэтных варыянтаў.

— Гэта значыць, што мужчыны перасталі быць рамантыкамі?

— Я сказала б, наадварот. Кветкі цяпер дарагія, і калі ўжо іх дораць, то сапраўды ад усяго сэрца. Часта бывае, пытаюся, колькі вам штучак, а мужчына адказвае: трэба грошы палічыць, на колькі хопіць. Калі апошнія грошы мужчына вырашае аддаць на кветкі для каханай, мне здаецца, гэта і сапраўды рамантычна.

Заўважым, што калі ў мінулыя гады прадаўцы наракалі, што купляюць 8 Сакавіка часцей за ўсё цюльпаны, сімвал вясны — раней яны былі значна таннейшыя за ружы, — то цяпер разрыў цэн стаў нашмат меншым. Цюльпаны ўжо сёння па чатыры рублі за кветачку, а да 8 Сакавіка, сімвалам якога з'яўляюцца менавіта гэтыя кветкі, яны, відавочна, падаражэюць. Раней, калі памятаеце, сімвалам Міжнароднага жаночага дня былі мімозы, але сёння яны не такія папулярныя. У апошнія гады значны працэнт пакупнікоў робіць выбар на карысць руж, кажа Марына. Гэта зразумела: ружы — хоць і банальны, затое бяспройгрышны варыянт. У Беларусь ружы вязуць у асноўным з Кеніі, Калумбіі і Эквадора, імпартныя цюльпаны — часцей з Нідэрландаў. Адсюль і кошт. Вядома, напярэдадні вясновых свят у пераходах метро і на рынках выстройваюцца шэрагі прадаўцоў цюльпанаў «уласнай вытворчасці», але ж і для іх вырошчвання звычайна выкарыстоўваюцца імпартныя цыбуліны. Так што калі ў папярэднія гады цюльпаны каштавалі ў сярэднім у два разы танней за ружы (а бывала, што і ў тры), то ў гэтым годзе яны набліжаюцца па кошце да руж.

Іншая справа, што з ружамі таксама не ўсё так адназначна. Чым вышэй і буйней ружа, тым яна даражэйшая — у сярэднім па Мінску пакуль што 7, 8.50, 9.50 і 12 рублёў, але цэны ўжо падымаюцца: свята ўсё бліжэй. Прадаўцы распавядаюць: па традыцыі нашы мужчыны аддаюць перавагу высокім ружам на доўгіх ножках — часам выбіраюць нават адну дарагую ружу замест трох таннейшых і нізкэшых. Здавалася б, навошта плаціць за доўгае сцябло? Але такая ружа выглядае стройнай і шляхетнай, а на «мове кветак» адна падораная ружа — гэта пасланне: «Для мяне ты адзіная!» Так што не крыўдуйце на свайго мужчыну, калі ён паднёс вам усяго адну ружу: можа быць, справа не ў меркантыльнасці, а якраз у зашыфраваным рамантычным «меседжы».

Можна, вядома, абраць ружачкі таннейшыя: паменш, на невысокіх тонкіх ножках. Сёння вялікі выбар беларускіх руж — можна замовіць іх анлайн або з'ездзіць, напрыклад, на вакзал, дзе шмат павільёнаў, якія гандлююць ружамі вытворчасці «ДарАРС». Каштуе беларуская ружачка ў сярэднім 3 рублі 20 капеек (белая ці крэмавая), ці 3.60 (ярка-пунсовая). Але ў нашых шыротах «волатамі», як у Кеніі ці Калумбіі, ружы не растуць — і бутоны невялікія, і ножкі танюткія, і пах няяркі (паўднёвыя часам напаўняюць водарам усю кватэру). Такім чынам, тут таксама ёсць «падводныя камяні»: такую ружу адну не падорыш, занадта ўжо сіратліва будзе выглядаць падарунак. Яны добрыя ў вялікіх букетах: штук 10-15 або нават 25. Так што сэканоміць не атрымаецца. Іншая справа, што букеты з невялікіх ружачак атрымліваюцца мілымі, далікатнымі, «французскімі». І выдатна выглядаюць у руках дзяўчыны на фатаграфіях у сацсетках: не перацягваюць на сябе ўвагу, а толькі адцяняюць прыгажосць сваёй «гаспадыні».

У мэтах эканоміі

Як сэканоміць на кветках на 8 Сакавіка, што раяць самі прадаўцы? Ну, па-першае, купіць загадзя. «Свежыя кветкі» на практыцы — усяго толькі рэкламная хітрасць. Уявіце, колькі дабіраюцца да Мінска, Гродна ці Гомеля тыя ж ружы з Эквадора або Кеніі. І потым нярэдка яны яшчэ столькі ж часу знаходзяцца ў лядоўнях на аптовых складах. Так што калі вы набудзеце кветкі за 2-3 дні да запаветнага восьмага чысла, нічога з імі не здарыцца, вы істотна сэканоміце, ды і выбар будзе большы, а пакупнікоў менш. Але важна падумаць, дзе вы будзеце захоўваць свой «рамантычны запас». Тэмпература патрэбная ад двух да сямі-васьмі градусаў: так свой тавар захоўваюць прафесіяналы кветкавага бізнесу. У вас гэта можа быць, напрыклад, халадзільнік. Або гараж, склеп, лоджыя. Цюльпаны, аказваецца, прадаўцы кветак захоўваюць без вады, загорнутымі ў паперу — «абудзіць» іх трэба гадзіны за дзве да ўручэння, падрэзаўшы сцёблы і «напаіўшы» вадой. А вось ружы і хрызантэмы неабходна паставіць у ваду адразу і разам з вадой — у цёмнае прахалоднае месца, той самы склеп ці гараж.

Па-другое, аб'ядноўвайцеся. Аптовыя склады — найлепшае месца для пакупкі кветак на 8 Сакавіка, бо і рознічныя прадаўцы затарваюцца там. А чым большая партыя, тым ніжэйшая цана. Чаму б не аб'яднацца з калегамі, сусядзямі ці сябрамі — так дакладна атрымаецца сэканоміць. Тры кветачкі тут не купіш, а не менш 10-50 штук. Затое нацэнка мінімальная.

Яшчэ адзін варыянт — для творчых асоб: купіць шмат букецікаў на касе ў буйных гандлёвых сетках (дзякуючы вялікім аб'ёмам і прамым пастаўкам ад вытворцаў такія букецікі там традыцыйна таннейшыя) і, разгарнуўшы, самастойна скласці прыгожыя фларыстычныя кампазіцыі. Проста падарыць набыты на касе прадуктовай крамы букецік — так сабе варыянт: зусім не пра рамантыку і наўрад ці пра каханне. Хутчэй пра жаданне «адкупіцца» ад традыцыі, якая не здаецца такому дарыльшчыку «добрай».

Ну а каб «залатыя» па цяперашніх часах кветкі прастаялі даўжэй, выбіраем нераскрытыя цюльпаны (у ідэале — у фазе бутона, можна нават яшчэ зялёнага), а ружы — «у кашулі» (гэта ніжнія грубаватыя пялёсткі з зялёнымі прожылкамі. Калі іх абарвалі, верагодна, ружы нясвежыя). Ну а наконт парады «не брыце гатовыя букеты, у іх ідзе кветкавая «некандыцыя», усё не так, кажуць прадаўцы. Па іх сцвярджэнні, парада гэтая даўно састарэла. «Некаторыя думаюць, што ў букеты мы выкарыстоўваем нераскупленыя рэшткі». Такое здаралася гадоў восем-дзесяць таму. Сёння ў кветкавым бізнесе — велізарная канкурэнцыя, і ніхто не стане прадаваць фларыстычныя кампазіцыі, у якіх кветкі завянуць на наступны дзень, тлумачаць яны. Наадварот, букеты складаюцца так, каб іх не прыйшлося разбіраць праз некалькі дзён, выдаляючы звялыя бутоны.

Зрэшты, гатовыя букеты — гэта ўжо сапраўды не пра эканомію. А вось кветкі ў скрынках — якраз пра яе. Да таго ж гэта сучасна і экалагічна. У гэтым годзе ўжо ў канцы лютага выбар быў сапраўды шырокім: архідэі, гіяцынты, хрызантэмы, дробныя кустовыя ружы самых розных колераў і адценняў. Выглядае такі «букет» цалкам годна, а каштуе ў разы танней за кампазіцыі з кветак у зрэзцы. І пражыве значна больш доўгае жыццё. Кошт архідэі фаленопсіс у скрыні, напрыклад, у межах 27-30 рублёў, хрызантэмы — 22-24 рублі. У пошуках такога «кветкавага падарунка» можна наведаць, дарэчы, садовыя аддзелы будаўнічых гіпермаркетаў.

Яшчэ адзін варыянт — вырасціць кветкі з цыбуліны самастойна. Выганка — нескладаны комплекс мер для паскарэння працэсу вегетацыі, праверaны дзесяцігоддзямі спосаб прымусіць расліны квітнець у патрэбны вам перыяд. Прарабіць такі фокус можна толькі з цыбульнымі і дробнацыбульнымі раслінамі: гіяцынтамі, нарцысамі, цюльпанамі, мускарамі, крокусамі, пушкініямі. Але аб гэтым трэба было паклапаціцца загадзя.

А ці патрэбны кветкі?

І нарэшце, вы ўпэўненыя, што ваш «адрасат», то-бок тая жанчына, якой вы дорыце букет на 8 Сакавіка, сапраўды будзе яму рада? А што як ваша жанчына да кветак абыякавая? У гэтым выпадку букет на жаночы дзень... мабыць, усё ж патрэбны, але — сімвалічны. Многім паненкам, напрыклад, да душы «палявыя кветкі» (скажам, «псеўдапалявыя» рамонкавыя хрызантэмы: іх суквецці падобныя на рамонкі. Або гваздзічкі Шабо. Або ірысы). А вось аб падарунку (не толькі ў гэтым выпадку, але ў гэтым — асабліва!) варта патурбавацца. І няхай гэта будзе не кантрафактны парфум, набыты мімаходзь, па дарозе, і не рондалі-патэльні. Калі вы цвёрда вырашыце для сябе не скочвацца на «банальшчыну», то зразумееце: ёсць дзясяткі спосабаў парадаваць дарагіх вам жанчын. Трэба толькі захацець.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

«ПАКУЛЬ БУДУЕШ — ЖЫВЕШ»

Сёння найважнейшая задача — забеспячэнне належных умоў работы і побыту для тых, хто хоча жыць і працаваць на сваёй зямлі, перакананы дырэктар філіяла ААТ «Крыніца» «Вялікая Раёўка» Іван ДАМАШЭВІЧ. І адна з ключавых роляў тут належыць сферы будаўніцтва.



Сяргей ЦЕРАБУНЦАЎ, Сяргей ЛАЗЮК, Уладзімір АНТОНІК – вопытныя будаўнікі, дзякуючы працы якіх «Вялікая Раёўка» набывае сучаснае аблічча, а гаспадарка закладвае трывалы падмурак пад сваю будучыню.

— Шмат у чым прагрэс для любой гаспадаркі вызначае менавіта сфера будаўніцтва. Калі яно вядзецца — гаспадарка жыве. Перастанеш будавацца — прадпрыемства чакае ў лепшым выпадку стагнацыя, а то і рэгрэс, — кажа кіраўнік.

У «Вялікай Раёўцы» актыўна развіваюцца будаўніцтва і мадэрнізацыя як вытворчых, так і сацыяльных аб'ектаў. Абнаўленне закранула фермы, майстэрні, жылыя дамы. За апошнія гады філіял пабудаваў 11 новых сянажнасіласных траншэй, поўнасцю рэканструявана тэрыторыя мехдвара і адміністрацыйнага блока, праведзена мадэрнізацыя ўсіх выгульных двароў для жывёлы, асфальтаванне і добраўпарадкаванне тэрыторый малочнатаварных ферм. Адрамантаваны ўсе блокі малочнай вытворчасці, у тым ліку душавыя, кухні, памяшканні для адпачынку работнікаў. Уведзена ў эксплуатацыю пасля рэканструкцыі абноўленая ферма на 200 галоў, сёння надоі тут складаюць 25 л на карову і 100 % малака рэалізоўваецца гатункам «экстра». Важным праектам стала мадэрнізацыя будынка вытворчых майстэрань і бытавых памяшканняў на МТП філіяла.

У сацыяльнай сферы будаўніцтва накіравана ў першую чаргу на абнаўленне жылога фонду. Гаспадарка купляе пустыя дамы і рэканструюе іх. Такім чынам, за восем гадоў работнікам былі прапанаваны 15 камфартабельных жылых памяшканняў — з аціпленнем, электрычнасцю, сучасным рамонтам. Цяпер у планах — будаўніцтва жылля з нуля: неўзабаве тут будзе ўзведзена пяць новых катэджаў.

Яшчэ адзін кірунак будаўніцтва — узвядзенне і рэканструкцыя архітэктурных аб'ектаў, якія ствараюць непаўторнае аблічча гэтага кутка Беларусі. Менавіта з такой думкай тут узяліся за аднаўленне парку, закладзенага ў 1970-х. З'явіўся ў вёсцы і яшчэ адзін унікальны арт-аб'ект — месца памяці мірных ахвяр фашызму. А не так даўно ўрачыста з удзелам мітрапаліта адкрылі капліцу ў гонар Казанскага абраза Божай Маці. Закладзена ў Раёўцы нават уласная вінаградная плантацыя (2,5 га), а побач з ёй з'явілася невялікая аграсядзіба. У далейшым, па планах вяскоўцаў, яна прырасце вінакурняй, пякарняй і пчальнікам з лячэбнай тэрапіяй.

Усё гэта стала магчымым дзякуючы ўласнай будаўнічай брыгадзе філіяла. **Сяргей ЦЕРАБУНЦАЎ, Сяргей ЛАЗЮК, Уладзімір АНТОНІК** — вопытныя будаўнікі, вакол якіх сфарміраваўся касцяк брыгады.

— Мы трое з Пінска і Пінскага раёна, але адлеглась нас не спыняе, — распавядае Сяргей Церабунцаў. — Тут, у Вялікай Раёўцы, працаваць

Вядучы інжынер па працаёмкіх працэсах філіяла ААТ «Крыніца» «Вялікая Раёўка» Мікалай ЗАРЭМБОЎСКІ.

камфортна: ёсць добры, зладжаны калектыў, а кіраўнік умее чуць падначаленых і шанаваць прафесіяналізм.

Узначальвае будаўнічую «галіну» ў «Вялікай Раёўцы» **вядучы інжынер па працаёмкіх працэсах Мікалай ЗАРЭМБОЎСКІ.** Бацька пяцярых дзяцей, ён, як ніхто іншы, разумее важнасць будаваць для будучыні. Будаваць ужо сёння.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

УНП 601057158

Сямейная газета

Выпуск № 4 (229)

ПРА НАСЕННЕ ДЫ НАТХНЕННЕ

У апошні дзень лютага ў маршрутцы толькі і размоў было, што пра вясну. Хтосьці натхнёна распавядаў, што ўжо пасадзіў перцы на расаду ды радыс — у цяпліцу («на ўсялякі выпадак накрыла спанбондам, бо абяцаюць яшчэ невялікія замаразкі»), нехта запісаўся на аквааэробіку, актыўна рыхтуе цела да лета, нехта распачаў рамонт у доме, нехта закупіў «зімовы лес» для будучай лазні... «Жураўлі прыляцелі, і гусі, і шпакі, — з усмешкай паведамляе настаўніца пачатковых класаў, з якой ужо па традыцыі едзем побач першыя дзесяць хвілін. — Даўно не памятаю, каб так было ў лютым...» «А ў нас на клумбе ўжо пралескі распусціліся», — расказвае аднагрупнік па тэлефоне.

Пачынаючы з першага дня вясны ў транспарце і на вуліцах горада, па традыцыі, з'яўляецца ўсё больш і больш жанчын розных узростаў з кветкамі ў руках. Яны любуюцца імі, нюхаюць час ад часу і загадкава ўсміхаюцца. Дарэчы, з 1 да 10 сакавіка ў Цэнтральным батанічным садзе сталіцы праходзіць выстава кветак. У адным памяшканні спецыялісты сабралі чароўныя гіяцынты, далікатныя крокусы, сонечныя нарцысы і, вядома ж, цюльпаны. «Апошніх там больш як 70 сартоў, — дзеліцца пасля наведвання каляжанка. — Махровыя, падобныя да півоняў, папугайныя, якія нагадваюць апярэнне птушак... Але больш за ўсё мяне ўразілі ранняй вясной... галінкі бэзу. Гэты проста неверагодны калейдаскоп колераў і водараў быццам паскарае час. І чакаць кліматычную вясну становіцца крышачку лягчэй».

Асабіста мяне апошнім часам уразіў адзін здымак у інтэрнэце. На ім мужчына гадоў 50-ці стаіць ля серванта з кветкай у руках, а ўся падлога застаўлена скрынямі з рознакаляровымі цюльпанамі. І подпіс: «Беларус вырошчвае цюльпаны прама ў сваёй кватэры». Уражаў мужчына збірае ва ўласнай гасцёўні. І, відаць, ужо не ўпершыню. У доме, насупраць канапы, стаіць і спецыяльнае асвятленне, і гаршкі з апорамі.

Наогул, мужчыны, якія захапляюцца кветкамі, мяне вельмі натхняюць. Сярод маіх знаёмых такіх трое. Адзін з іх, Кірыл Кветка, задумаў чарговы праект. На працягу трох вясновых месяцаў ён запрашае ўсіх далучыцца да Кветкавага марафону, які хлопец запусціў разам з «Бібліятэкай раслін». Для гэтага патрэбна пры падтрымцы дасведчаных спецыялістаў высяваць насенне садовых раслін, на падаконніку вырошчваць расаду, потым перадаць яе ў брэсцкі Кветка-Парк, які Кірыл стварыў пры ўніверсітэце, дзе вучыцца. Там будзе зроблена шэсць клумб — па адной ад кожнай вобласці нашай краіны. Восенню ж на спецыяльным мерапрыемстве вызначаць найлепшую. «Калі вы хочаце вырошчваць расаду толькі для свайго ўчастка, таксама далучайцеся да марафону, будзе цікава», — запрашае Кірыл.

Пакуль пісала пра Кірыла, згадала пра яшчэ адзін душэўны праект, у якім сама летась прымала ўдзел. Траўніца Настуся перад пачаткам садова-агародных спраў разам з бабулямі Палесся збірае наборы для пасадкі маленькага агарода, дзе ёсць месца і для гародніны, і для лекавых раслін, і для кветак. І рассылае іх за сімвалічную плату ўсім ахвотным. Каштоўнасць такіх набораў у тым, што ў іх уваходзіць насенне, вырашчанае без выкарыстання пестыцыдаў, хімікатаў, ГМА, гібрыдызацыі. Дарэчы, Настуся стварыла ў Тэлеграме карысную суполку «Юныя Натуралісты» для садаводаў-пачаткоўцаў і агароднікаў. І з канца лютага натхняе народ на агародныя подзвігі. На днях падзялілася дакументальным фільмам пра дзвюх сяцёр Олю і Таню, якія стварылі сваю Кветкавую ферму. У планах дзяўчат (адна з іх, дарэчы, раней працавала праграмістам, другая — архітэктарам) не толькі пашыраць пасяўныя плошчы пад кветкі на продаж, але і засеяць вялікае поле цюльпанамі, каб усе ахвотныя вясной маглі прыехаць, натхніцца, пафатаграфавацца. Прыемна было слухаць іх маці, якая спачатку не вельмі разумела новае захапленне дачок, не надта верыла ў яго поспех. А цяпер сама з задавальненнем дапамагае ім і атрымлівае асалоду. Жанчына прызналася, што кветкавая ферма вельмі зблізіла іх сям'ю.

Восенню я набывала цыбуліны цюльпанаў колеру слановай косці на рынку ў мужчыны- кветкалюба. Менавіта ён распавёў мне пра цікавую звычку славутага Гётэ. Той набіваў кішэні... насеннем кветак. І куды б ні ішоў, паціху іх раскідваў уздоўж дарог. Калі Гётэ памёр, засталося шмат месцаў у Германіі, якія былі спрэс засеяны кветкамі. «Калі расказваю гэтую гісторыю сваім пакупніцам, многія натхняюцца, кажуць, што яны таксама не супраць так упрыгожваць планету. «Але ж дзе ўзяць столькі насення, яно ж такое дарагое?..» А не абавязкова яго набываць. Можна збіраць самім у сезон. Напрыклад, бачыце — касмея квітнее, вазьміце насенную скрыначку і рассейце...»

Як бачыце, не толькі птушкі сеюць насенне... Пасеяць яго, як і натхненне, у сэрцах іншых людзей па сілах кожнаму з нас.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

Тыя, хто побач

Заслужаная артыстка БССР Тамара РАЕЎСКАЯ:

«НЕ ЎМЕЮ СПЯВАЦЬ НАПАЎГОЛАСУ І ЖЫЦЬ НАПАЎСІЛЫ»

ЧЫСТЫ, моцны і далікатны, як званочак, голас заслужанай артысткі БССР Тамары Раеўскай незабыўны. На жаль, песні ў яе выкананні ўжо амаль не гучаць па радыё — сёння ў трэндзе іншы фармат, але тыя, хто чуў іх раней, памятаюць і любяць спявачку, знаходзяць у сеціве. Для многіх Тамара Рыгораўна — сімвал жаноцкасці і элегантнасці.

Яна нарадзілася ў Асіповічах, потым сям'я пераехала ў Мінск. Пасля заканчэння школы Тамара паступіла ў Маладзечанскае музычнае вучылішча на дырыжорска-харавое аддзяленне. Аднак вучобу прыйшлося прыпыніць: Тамара захварэла на туберкулёз і, каб сумяшчаць лячэнне і працу, уладкавалася ў рэгістратуру 3-й клінічнай бальніцы Мінска. Тады яна сур'ёзна думала звязаць свой лёс з медыцынай. Але ўмяшаўся яго вялікасць выпадак. Тамары паведамілі, што на рэспубліканскім радыё аб'явілі конкурс салістаў. Яна рызыкнула паспрабаваць. І яе прынялі на работу! Так вырашылася пытанне, кім быць: спявачкай ці медыкам. Цяпер ужо работа на Беларускім радыё сумяшчалася з вучобай у Мінскім музычным вучылішчы.

— Мне падабалася спяваць, у мяне ўся сям'я музычная: хто на скрыпцы, хто на баяне іграў. Але і медыцына была цікавая. Можна сказаць, што маю мару пра медыцыну ўвасобіла ўнучка, якая пайшла па прафесійных слядах дзеда і бацькі.

— А як вы пазнаёміліся са сваім мужам?

— Я тады працавала ў бальніцы, убачыла доктара Аляксандра Губко — і ўсё... страціла спакой. Шлях да сямейнага жыцця заняў шэсць гадоў. За гэты час я паспела звольніцца з бальніцы. Думаю, што муж асцерагаўся распаўсюджанай думкі, маўляў, артыстка — легкадумнае стварэнне, добрай жонкі з яе не атрымаецца. Муж быў фанатам сваёй прафесіі. Ён упершыню ўбачыў цягнік, калі ехаў паступаць у медінстытут. І вось гэты вясковы хлопец абараніў доктарскую дысертацыю, стаў прафесарам. Але замуж я выходзіла яшчэ за радавога ўрача.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

Свет захапленняў

ПТУШКА... НА ШЧАСЦЕ

Як звычайная чайка змяніла жыццё маладой сям'і

ВЯДОМА, што нашы продкі для прыцягнення ў дом поспеху і шчасця выраблялі розныя прадметы. Адным з такіх сімвалаў з даўніх часоў з'яўлялася драўляная птушка. Аб гэтым славянскім абярэгу ёсць нават прыгожая легенда. Шмат гадоў таму ў марозную зіму ў адной вёсачцы вельмі цяжка захварэў маленькі хлопчык. І ўжо ніякія адвары і настойкі, ніякія знахары і лекары не маглі дапамагчы. І вось аднойчы вечарам хлопчык прыўзняўся на ложку і слабым голасам спытаў: «Тата, а калі прыйдзе вясна?» — «Калі птушкі прыляцяць», — адказаў той. «Вось калі птушкі прыляцяць, тады я і ачуняю», — ціха прамовіў хлопчык. І тут у галаву тату прыйшла геніяльная ідэя, як паскорыць прыход вясны: ён выразаў з кавалка дрэва птушачку і павесіў над ложачкам сына. І здарыўся цуд! Хлопчык спачатку глядзеў, як яна кружыла над яго галавой, а потым, на ўсеагульнае здзіўленне і радасць, пайшоў на папраўку.

Героі гэтага артыкула таксама выраблюць драўляных птушак. Яны шчыра вераць, што іх крылатыя буслы ды ластаўкі абавязкова прынясуць шчасце ў дом сваіх гаспадароў.

Як выпадковая пакупка стала справай жыцця? І ці сапраўды так шмат усяго нам патрэбна для шчасця? Пра гэта і не толькі размаўляем з Дзмітрыем і Юліяй ГАРОШКІ, стваральнікамі сямейнай майстэрні «Пад Крылом».

(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)

Мілыя, добрыя, дарагія і проста нашы любімыя

Беларускія селебрыці віншуюць з 8 Сакавіка жанчын, якія побач з імі, і ўсіх-усіх самых добрых, прыгожых, мудрых і прыўкрасных

Раман КОЗЫРАЎ:

«За гучным мужчынскім поспехам стаяць сціплыя і працавітыя жанчыны»

«Алеся», «Александрына», «Вераніка», «Марыся», «Стася» — і гэта далёка не ўся песенная галерэя, створаная «Песнярамі». Больш чым за паўстагоддзя існавання гэтага калектыву ў Беларусі (і не толькі) з'явіліся сотні, а то і тысячы Веранік, Алесь, Янін, Маргарыт — так бацькі называлі дачок, натхніўшыся мілымі вобразамі з прыгожых песень.

— Склаўся стэрэатып, што «Песняры» — мужчынскі калектыў, але гэта не так, — кажа **Раман КОЗЫРАЎ, мастацкі кіраўнік — дырэктар заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь БДА «Песняры»**. — Без спявачкі Людмілы Ісупавай не адбылася б у свой час рок-опера «Песня пра долю». Алена Іванаўна Прахіна 26 гадоў працуе касцюмерам у нашым калектыве, і дзякуючы ёй мы заўсёды элегантна выглядаем на сцэне. Як дырэктар, я заўсёды ўпэўнены, што вядучы юрысконсульт Вольга Барысевіч і галоўны бухгалтар Алена Зрайкоўская пісьменна і своечасова падрыхтуюць дакументы, адміністратар Тамара Шахназарава ўсё дакладна арганізуе, а Вера Пятроўна Сакалоўская створыць утульнасць у нашай студыі. Так, у жыцці часта бывае, што жанчыны займаюць быцам бы другарадныя пасады, часам адыгрываюць незаўважныя ролі, але без іх немагчыма абысціся. І часта за гучным мужчынскім поспехам стаяць сціплыя і працавітыя жанчыны, якім мы вельмі ўдзячныя.

Мы гаворым шмат добрых слоў нашым жонкам, таму што на іх плечы кладзецца ўвесь клопат аб нашых сем'ях, яны — наш тыл, наша апора. Жонкі аберагаюць нашы дамы, пакуль мы на гастролях, а летась мы правялі ў камандзіроўках 190 дзён. Больш як паўгода нашы жонкі, па сутнасці, нясуць падвойную сямейную нагрузку — гэта вялікая работа, за якую мы ім удзячныя. Усе яны цудоўныя мамы. А яшчэ яны тыя жанчыны, якія не толькі церпяць нас, музыкантаў, якія як мінімум не самыя вялікія дамаседы, але і прымаюць нас такімі, якія мы ёсць. Нават гавораць, што з намі цікава.

У гэты дзень мы думаем пра нашых дачок, у мяне трое дзяцей і сярод іх адна дачушка. У калег таксама ёсць дочкі, ведаю, што да іх асаблівае стаўленне — гэта наша радасць, мы ўсе вельмі трапятліва ставімся да іх, яны — праменьчык сонца. Сыноў выхоўваем больш сурова. А дочкі — нашы кветачкі, далікатныя стварэнні, яны — самыя пяшчотныя струны нашых душ.

...Павіншаваць хочацца сваіх жонак, дачушак, мам і ўсіх жанчын Беларусі з самым добрым вясновым святам, якое дорыць надзею, што прыйдуць сонечныя дні. Нашы любімыя! Здароўя, кахання, дабрабыту, шчасця, удачы, і дзякуй за тое, што вы ёсць!

Вольга БАРЫСЕВІЧ, Алена ЗРАЙКОЎСКАЯ, Алена ПРАХІНА, Вера САКАЛОЎСКАЯ, Тамара ШАХНАЗАРАВА.

Фота Вікторыі ІВАНЧЫКАВА.

Аляксандр ВАВІЛАЎ:

«Трэба заўсёды казаць ласкавыя словы»

*Дацэнт, лаўрэат Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва, лаўрэат Прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва, паэт-песеннік, рэжысёр-пастаноўшчык — так афіцыйна прадстаўляюць **Аляксандра ВАВІЛАВА.** А яшчэ ён ганарыцца тым, што бацька і дзядуля. І вядома, аўтар вершаў да прыгожых лірычных песень застаецца паэтам, нават калі тэкст выкладзены ў прозе:*

— Віншуючы самую блізкую табе Жанчыну, зазірні ў яе сэрца. У сэрцы Маці ты заўсёды знойдзеш сябе — сына. І словы для Мамы нараджаюцца самі па сабе, іх не трэба прыдумляць, надзімаючы шчокі ў пошуках арыгінальнасці. Павіншуй проста: жыві даўжэй, Матуля...

У сэрцы Каханай ты заўсёды знойдзеш люстэрка, у якім адлюстроўваешся ты. Ці не ты?.. Трэба прыгледзецца больш уважліва. Трэба быць заўсёды ўважлівей, гаварыць ласкавыя словы, рабіць сапраўдную справу, ісці прамой дарогай, верыць, дараваць, абараняць... Павіншуй проста: будзь каханай, Любімая...

У сэрцы Дачкі ты заўсёды знойдзеш чыёсьці юнае аблічча, якое і падобнае ў нечым на цябе, а ў нечым і засланяе цябе, таму што твая дачка закаханая. Закаханая! Якая ж гэта Вясна! Якое ж гэта Мора пачуццяў! Якое ж гэта Шчасце! Павіншуй проста: будзь шчаслівая, Прынцэса!

У сэрцы Незнаёмкі, выпадкова сустрэтай, ты знойдзеш Таямніцу... Ды не важна, што ты там знойдзеш! Павіншуй проста: няхай ніколі не народзіцца той вучоны, які разгадае гэтую Таямніцу. Таямніцу Жанчыны!

Са святам! Са святам! Са святам!

Маргарыта ДРАЗДОВА.
Фота з асабістых архіваў герояў.

Тарас ПРЫСЯЖНЮК:

«Вы дорыце нам вечнае пачуццё кахання!»

*Саліст Вялікага тэатра Беларусі, лаўрэат I прэміі Міжнароднага конкурсу маладых оперных спевакоў імя А. Абразцовай **Тарас ПРЫСЯЖНЮК** нядаўна парадаваў прыхільнікаў і прыхільніц сваёй творчасці прэм'ерай кліпа «Скрозь час». Да музычнага падарунка спявак дадае:*

— Дарагія жанчыны! Я ад шчырага сэрца хачу павіншаваць вас са святам вясны! Менавіта з пачаткам вясны прырода дорыць нам прыгажосць ва ўсіх яе праявах, натхненне і цудоўны настрой. Дзякуючы вам, нашы дарагія і любімыя жанчыны, мы, мужчыны, знаходзім сілы тварыць, здзяйсняем подзвігі, а самае галоўнае — вы дорыце нам вечнае пачуццё кахання!

Уладзімір МІШЧАНЧУК:

«Будзьце заўсёды любімымі!»

*Мэтр беларускай тэатральнай сцэны, зорка экрана, прафесар, заслужаны артыст БССР, родапачынальнік творчай дынастыі **Уладзімір МІШЧАНЧУК** віншуе жанчын разам са сваім унукам — скрыпачом **Ніканам МАЗАЛЁМ.***

У. М.: — Прыйшла доўгачаканая вясна, і месяц сакавік разам з сонечнымі промнямі дорыць усім нам сваё цудоўнае свята — Міжнародны жаночы дзень! Дарагая мая жонка Людміла (з якой мы пражылі больш за паўстагоддзя), дачушка Кацюша — скрыпачка мая, самая таленавітая! Усе жанчыны нашай любімай краіны! Са святам вас! Са святам міру і прыгажосці, грацыі і зачаравання! Разам са сваім унукам, непаўторным, пацалаваным Богам скрыпачом, цяпер — абаронцам Айчыны — Ніканам Мазалём віншуем вас усіх! Жадаем здароўя і ўдачы, поспехаў у вашых справах, працы, вучобе і, безумоўна, у творчасці! Шчырых усмешак, чароўнага настрою, незабыўных жыццёвых адкрыццяў і ўражанняў!

Н. М.: — А яшчэ добрых навін і выдатных падзей!

У. М.: — Будзьце заўсёды каханымі! Няхай здароўе, поспех і дастатак заўсёды будуць з вамі! Няхай усе жаданні спраўдзяцца, а жыццё будзе напоўнена імгненнямі бясконцага шчасця!

Н. М: — Дарагая мая, самая любімая і родная мама! Я хачу пажадаць табе толькі аднаго: каб усмешка заўсёды была на тваім твары! Усе непагадзі няхай абмінуць нас і пройдуць бокам, смутак забудзецца, настрой будзе па-сапраўднаму вясновым і радасным! Такія ж пажаданні маёй непаўторнай, патрабавальнай, таленавітай, самай разумнай і добрай бабулі Людміле!

У. М.: — Я далучаюся да сказанага...

Н. М.: — І яшчэ, як абаронца Айчыны, хачу пажадаць нам усім міру! А ты, мамачка мая, упрыгожваеш гэты свет сваёй творчасцю і робіш яго лепшым! Дзе б я ні быў, я заўсёды буду тваім сынам і памочнікам. Няхай жыццё цябе песціць шчасцем, а лёс будзе дарогай да мар, бо ты вартая толькі лепшага! Са святам усіх жанчын нашай любімай краіны!

Уладзімір МІШЧАНЧУК з жонкай, дачкой і ўнукам.

Гурт «Чысты голас».

Валерый ПРЫГУН:

«Вы — Чараўніцтва, вы — Натхненне»

*Пра каго спявае вакальная група «Чысты голас»? Вядома ж, пра жанчын. І вось што ім жадае мастацкі кіраўнік калектыву **Валерый ПРЫГУН:***

— Мілыя, дарагія, любімыя нашы жанчыны! Дзіўныя і непаўторныя прадстаўніцы прыгожага полу!

Улюбляйце нас у сябе, захапляйце нас сваёй прыгажосцю, асвятляйце сваім унутраным святлом. Кожную секунду вы дорыце нам радасць і цеплыню, саграваеце душой сваіх каханых і блізкіх.

Няхай вашы мілыя твары не пакідае ўсмешка, а вочы зяюць ад шчасця. Вы — Чараўніцтва, вы — Натхненне, вы — Паветра, без якога нам не жыць!

Са святам Вясны, Шчасця і Любові!

«НЕ ЎМЕЮ СПЯВАЦЬ НАПАЎГОЛАСУ І ЖЫЦЬ НАПАЎСІЛЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— Як ён успрыняў тое, што вы застаецеся на сваім прозвішчы?

— Па пашпарце я Губко, Раеўская — толькі на сцэне. Ён, дарэчы, і не настойваў, каб я пераходзіла на яго прозвішча. Яму здавалася, што гэта створыць нязручнасці для мяне. Потым ужо, калі трапляла ў бальніцу, для медыкаў была жонкай прафесара Губко.

Дарэчы, існуе сямейная легенда, што Раеўскія мы з 1812 года, калі малады рускі афіцэр закахаўся ў юную сялянку і даў сваё прозвішча іх сыну.

Здараліся казусы з-за сугучча майго прозвішча і дырыжора Барыса Іпалітавіча Райскага. Было, дыктары аб'яўлялі: дырыжор Барыс Раеўскі, спявае Тамара Райская.

— Ад музыкантаў старэйшага пакалення чула: маўляў, Раеўская магла б больш зрабіць на сцэне, калі б не была так сканцэнтравана на сям'і. А вы самі задаволены тым, як склалася кар'ера?

— Цалкам. І сям'я на першым месцы — гэта мой усвядомлены выбар, аб якім я ні разу не пашкадавала. Можа, гэта ідзе ад выхавання, але я ніколі не ўспрымала такія тыпова жаночыя хатнія справы — прыгатаваць, прыбраць, папрасаваць — як нейкую катаргу. Мне падабалася, бо я рабіла гэта для сябе і блізкіх. Сям'я не замінала. Адзінае — я адмаўлялася ад працяглых гастроляў.

Лічу, што добра выглядаць трэба найперш для самой сябе. Тады ў цябе добры настрой, упэўненасць, і гэта трансліруецца навакольным людзям.

А што да кар'еры, то мне даваралі першае выкананне сваіх песень выдатныя беларускія кампазітары: Яўген Глебаў, Юрый Семяняка, Ігар Лучанок, Уладзімір Буднік. Мы творча супадалі: і ў мяне вельмі высокія патрабаванні да тэкстаў, і ў іх. Больш за тое, мы ўсе сябравалі. У нас на радыё была цудоўная творчая атмасфера!

У маёй кар'еры было шмат «упершыню». Музыказнаўца Элеанора Язерская прапанавала мне правесці канцэрт у фармаце творчага вечара. Раней ніхто з эстрадных выканаўцаў такога не рабіў. Мы разам складалі праграму, а каб разбавіць песні, я напісала некалькі вершаў. Элеанора вяла канцэрт. У мяне ёсць запіс на флэшцы, і часам я яго пераглядаю. Ён дарагі мне тым, што ў зале прысутнічае сям'я, яшчэ жывыя мама і муж, сябры, калегі.

Потым я паспрабавала сябе ў ролі прадзюсара, хоць такіх слоў мы тады нават і не ведалі. Да мяне дадому прыйшла Святлана Кульпа і папрасіла яе праслухаць. Мне вельмі спадабаўся яе голас, вырашыла дапамагчы маладой спявачцы. Мы займаліся, складалі рэпертуар, разам паехалі на Усесаюзны конкурс на найлепшае выкананне савецкай песні. Святлана атрымала званне лаўрэата, што давала ёй добрыя перпектывы. Як цяпер кажуць, Святлана Кульпа — мой праект. Рада, што мы і цяпер сябруем.

— Песня Юрыя Семянякі на вершы Уладзіміра Карызны «Люблю цябе, Белая Русь» — адна з вашых візітак:

Жытнёвае поле, лясы і азёры,
Крынічанька ў лузе
і ў небе жаўрук.
Услухайся толькі,
усё тут гаворыць:
Люблю цябе, Белая, Белая Русь.



Муж Аляксандр ГУБКО.

Шкада, што гэтае кранальнае прызнанне ў любові да нашай Беларусі цяпер знойдзеш толькі ў фондзе радыё, а не ў эфіры. А яшчэ найпапулярнейшая «Хаджу сунічнымі барамі», у народзе вядомая як «Песенька мая яшчэ не спета». Мне ў маленстве падабалася мелодыя і ваш артыстызм, а цяпер разумею, што гэта песня давала крылы тым, хто адчуваў так званы цяжар узросту, каму тады было 45-50 гадоў.

— Гэту песню я замовіла да свайго творчага вечара. Кажу паэту Карызну: «Уладзімір Іванавіч, рабіце што хочаце, але каб фраза «Ды песенька мая яшчэ не спета» была рэфрэнам». А мая сяброўка Ларыса Васілеўна Глебава папрасіла свайго мужа Яўгена Аляксандравіча напісаць музыку. Песня адразу спадабалася публіцы, на канцэртах заўсёды выконвала яе на біс па два, а то і па тры разы!

Шмат чытаю, разгадваю крыжаванкі, слухаю музыку. Шмат разважаю — мне нясумна з сабой.

— Развітанне са сцэнай у вас атрымалася некалькі вымушаным: пасля гастроляў у раёне ЧАЭС з'явіліся некаторыя праблемы з голасам. Можна было зрабіць аранжыроўкі лягчэйшымі і працягваць спяваць...

— Самыя незвычайныя мае гастролі: замест кветак нам дарылі... рэспіратары. На градках велізарныя клубніцы, а пакаштаваць нельга... Так, вы правільна кажаце, што можна было неяк выкруціцца, не ўсе ноты браць, але я не ўмею спяваць напаўголасу і жыць напаўсілы. Гэта ўжо было б несумленна ў дачыненні да публікі: была б нейкая не тая Тамара Раеўская.

Ведаю, што сыход са сцэны для многіх прыраўноўваецца да канца жыцця. У мяне сям'я, я не адна, ёсць глеба пад нагамі, таму вялікай трагедыі не было. Да таго ж мне адразу паступіла прапанова ад Міхаіла Фінберга — ён тады стварaў канцэртны аркестр, які цяпер носіць яго імя. Аркестру патрабаваўся педагог па вакале, і я з задавальненнем узялася за гэтую работу.

Афіцыйным жа развітаннем са сцэнай быў мой юбілейны вечар, які мяне пераканала правесці Людміла Палкоўнікава. Прызнацца, я не вельмі верыла ў свае сілы, а Люда ўмее купіраваць гэты стан. У яе цудоўная інтуіцыя, яна ведае, у якім кірунку рухацца кожнаму артысту.

— Людміла Георгіеўна расказвала, што вы прасілі: «Толькі не называйце мяне зоркай!»

— Так, прасіла: не люблю, проста не выношу пафасу. Вечар атрымаўся вельмі цёплы, з прыемнымі сюрпрызамі. Удзячная Людміле, што яна тады праявіла настойлівасць.

Сям'я на першым месцы — гэта мой усвядомлены выбар, аб якім я ні разу не пашкадавала.

ТОП-5 ПЕСЕНЬ У ВЫКАНАННІ ТАМАРЫ РАЕЎСКАЙ:

«ЛЮБЛЮ ЦЯБЕ, БЕЛАЯ РУСЬ». Музыка Юрыя Семянякі, словы Уладзіміра Карызны.

«ХАДЖУ СУНІЧНЫМІ БАРАМІ». Музыка Яўгена Глебава, словы Уладзіміра Карызны

«ЛЕТНЯЯ ГРОЗА». Музыка Яўгена Глебава, словы Уладзіміра Арлова.

«КАЛЫХАНКА МАМЕ». Музыка Іны Вінаградавай, словы Ніны Мацяш.

«Я ЛЮБЛЮ». Музыка Уладзіміра Алоўнікава, словы Адама Русака.

— Тамара Рыгораўна, для многіх жанчын вы былі эталонам стылю. Як атрымлівалася добра выглядаць, хто клапаціўся пра ваш сцэнічны імідж?

— Дзякуй! Думаю, прырода надзяліла мяне добрым густам. Канешне, перад запісам для тэлепраграм прычоскай і макіяжам займаліся спецыялісты. Часам нам дапамагалі са сцэнічнымі ўборамі. Нейкія сукенкі заказвала ў індпашыве сама, каб не мільгаць часта ў адным і тым жа. У адзенні мне падабаўся і падабаецца класічны стыль. Што да макіяжу, то ў жыцці, лічу, ён павінен быць ледзь прыкметны. Больш за ўсё мяне напружвала пазнавальнасць у побыце. То-бок калі аб'яўлялі маё імя і публіка ўжо апладзіравала, гэта прыемна, а вось калі пазнавалі на вуліцы, для мяне гэта заўсёды было нейкім няёмкім момантам.

Лічу, што добра выглядаць трэба найперш для самой сябе. Тады ў цябе добры настрой, упэўненасць, і гэта трансліруецца навакольным людзям.

— Раскажыце пра вашага сына, унучку...

— Сын пайшоў па прафесійных слядах бацькі, ён артапед-траўматолаг. І такі ж няўрымслівы, як бацька. Муж, памятаю, мог паўночы сядзець, распрацоўваць план аперацыі, улічваць усялякія магчымыя варыянты... Унучка таксама ўрач. Дарэчы, у той жа 6-й бальніцы, дзе была кафедра дзядулі.

Яны шмат працуюць. А мне, вядома, хочацца як мага часцей бачыць сваіх родных. Выдатна разумею, што работа ўнучкі патрабуе і фізічных, і душэўных сіл. У яе ёсць малады чалавек, яны наладжваюць сваё жыццё. Таму проста радуюся, калі яна мае час наведаць мяне.

Дарэчы, існуе сямейная легенда, што Раеўскія мы з 1812 года, калі малады рускі афіцэр закахаўся ў юную сялянку і даў сваё прозвішча іх сыну.

— Ці ёсць у вас хатні гадаванец?

— Трыццаць гадоў у мяне былі сабакі. Але калі пахавала апошняга, зразумела, што ўсё, больш не жадаю заводзіць жывёл, вельмі цяжка іх страчваць. Кожнае лета я праводжу на лецішчы, і неяк да майго ўчастка прыбіўся кот. Такі аднавокі разбойнік. Адразу было зразумела, што пасля заканчэння сезона ён з'едзе са мной у горад. А цяпер мы з ім лічым дні да пачатку дачнага сезона.

— Як праводзіце час на лецішчы?

— Атрымліваю асалоду ад жыцця. Для мяне гэта райскі куток! Участак у свой час выдзелілі маёй маме, яна працавала ў сістэме лясной гаспадаркі. Будаўніцтвам дома займаўся муж. Ён казаў маме: «Таццяна Іосіфаўна, у што вы мяне ўцягнулі?» У мамы быў раскошны агарод, нейкі час і я ім займалася, а потым сын як доктар пераканаў, што ад гэтай нагрузкі трэба ўжо адмовіцца. Цяпер толькі кветкі. Маю зносіны з суседзямі, шмат старажылаў, таму ёсць агульныя тэмы.

— Тамара Рыгораўна, у вас па-ранейшаму малады голас, вы выдатна арыентуецеся ва ўсіх падзеях. Што робіце для падтрымання такой формы?

— Мне проста цікава жыць! Таму шмат чытаю, разгадваю крыжаванкі, слухаю музыку. Шмат разважаю — мне нясумна з сабой. Шчаслівая, што ў мяне ёсць сяброўкі, часам мы жартуем: столькі не жывуць, колькі мы сябруем. Мы любім, як той казаў, пасядзець на тэлефоне, нас сагравaюць успаміны, але цікавімся і днём сённяшнім, і ў заўтра хочацца зазірнуць.

— Мы гутарым напярэдадні 8 Сакавіка. Што б вы пажадалі нашым чытачкам?

— Кахаць і быць каханымі! Клапоцячыся аб сваіх блізкіх, не забываць пра сябе. Прыслухоўвацца да свайго сэрца...

Ксенія КАВАЛЕЎСКАЯ.

Асілкам расце?..

Чаму таўсцеюць дзеці, і чым для іх небяспечнае атлусценне

ДЗІЦЯЧАЕ атлусценне — адна з надзённых праблем педыятрыі ў многіх краінах свету. Беларусь — не выключэнне. Зразумела, што прычына — у няправільным харчаванні і недахопе фізічнай нагрузкі. Здавалася б, дастаткова збалансаваць гэтыя два фактары — і праблема будзе вырашана. Але чаму тады яна застаецца актуальнай?

Пра тое, што правільнае харчаванне дзіцяці — падмурак яго здароўя ў будучыні, пастаянна паўтараюць медыкі і дыетолагі. Але часам нават самая старанная, матываваная і любячая мама не здольная забяспечыць свайму дзіцяці паўнавартасны рацыён. Разбяромся, чаму.

ПРЫЧЫНЫ ВІДАВОЧНЫЯ І НЕВІДАВОЧНЫЯ

• Шкодныя стэрэатыпы з мінулага

Што ў славянскай культуры спрадвеку лічылася меркай здароўя дзіцяці? Правільна: добры апетыт і круглыя чырвоныя шчочкі. «Асілкам расце!» — замілоўваюцца пажылыя суседкі, і мама задаволена: гэта ж пахвала ёй як клапатлівай... Змагацца з такім стэрэатыпам няпроста, бо яго карані ў мінулым нашай краіны. У страшных гадах вайны і пасляваенных цяжкіх, галодных часах, у памятным сучасным 50—60-гадовым савецкім дэфіцыце, калі даводзілася стаяць у доўгіх чэргах... З таго часу шмат што змянілася. Сёння недахопу ў прадуктах харчавання няма і не трэба запашваць калорыі ў сваім арганізме. Памяняліся і ўмовы жыцця: сучасным дзецям не даводзіцца дабірацца да школы пешшу за некалькі кіламетраў, не трэба ім ні ў вёсцы, ні тым больш у горадзе гадзінамі працаваць па гаспадарцы. Больш за тое, нават бегаць з аднагодкамі ў двары ў цяперашняй дзятвы ўжо «не модна». Затое цэлымі днямі і першаклашкі, і падлеткі сядзяць спачатку на ўроках у школе, потым, ужо дома, — за «дамашкай», далей, у вольны час, — у гаджэтах. Змянілася ўсё. А стэрэатып аб добрым апетыце застаўся. Гэтак жа, як і іншая «спадчына»: «Еш з хлебам!»; «У нас таварыства чыстых талерак»; каларыйная вячэра непасрэдна перад сном; хлеб з маслам, бульба з адбіўнушкай і макарошкі з катлетай (вугляводы + тлушчы — энергетычная бомба для арганізма); «Смачнае на трэцяе!» — здоба, шакаладныя цукеркі, дэсерт як завяршэнне трапезы.

Сюды ж аднясём і традыцыю ўзнагароджваць або суцяшаць дзіця «смачненькім» як фактар хуткага фарміравання харчовай залежнасці.

• «Дэлегаванне паўнамоцтваў»

Па меры сталення ў рацыёне сучаснага дзіцяці хутка з'яўляюцца не надта карысныя стравы з багаццем солі, заправак, фарбавальнікаў і кансервантаў. Досыць рана дзіця пачынае праводзіць значную частку часу ў арганізаваных калектывах (садок, школа), дзе яго харчаваннем, адпаведна, займаюцца не бацькі, а іншыя. Да таго ж дзіця само, па сваім меркаванні, траціць кішэнныя грошы. Заўважым, што гэта не камень у агарод школьнага ці дашкольнага харчавання. У апошнія гады ў нашай краіне гэтым пытаннем спецыялісты заняліся на дзяржаўным узроўні, і сёння можна казаць, што ў дзіцячых установах харчаванне збалансаванае і адпавядае прынцыпам дыеталогіі. Але ж дзіця есць не толькі ў школьнай сталовай. Па дарозе са школы, ідучы на гурткі ці ў секцыі, яно купляе гамбургеры, чыпсы, салодкую газіроўку, сокі з залішнім утрыманнем цукру, шакаладныя батончыкі, арэшкі ў глазуры, іншыя некарысныя прадукты. Ды і самі бацькі песцяць дзіця смачненькім, падтрымліваючы няправільныя харчовыя звычкі. Псіхолагі і дыетолагі па ўсім свеце вінавацяць у «эпідэміі» атлусцення непаўналетніх рэкламу, якая прыцягвае ўвагу дзяцей да прысмакаў і фастфуду.

• Няправільныя звычкі ў сям'і

«У нас у родзе ўсе аб'ёмныя», «Гэта гены», «Проста косць цяжкая»... Эндакрынолагі сведчаць: такія сцвярджэнні — не больш за самападман. Сапраўды, статыстыка пацвярджае: калі адзін з бацькоў мае лішнюю вагу, дзіця дасягне тых жа памераў у 30 % выпадкаў: калі ж поўныя і маці, і бацька, то малы пойдзе па іх шляху ў 60 % выпадкаў. Але гены тут звычайна ні пры чым. Бывае, што лішняя вага дзіцяці звязана з генетычнымі захворваннямі, але падобных выпадкаў каля 1 % ад усіх зваротаў наконт атлусцення непаўналетніх. Значна часцей прычына лішняй вагі дзяцей (як і іх бацькоў) у сямейных звычках, адсутнасці культуры здаровага харчавання. На працягу апошняга стагоддзя навукоўцы адкрылі больш за дзясятак генаў атлусцення, але асаблівасць гэтых генаў у тым, што іх уздзеянне зводзіцца на нішто правільным харчаваннем і фізічнымі нагрузкамі. Калі бацькі праводзяць выхадныя перад тэлевізарам, ужываючы піцу (гатаваць сучасныя гаспадыні часта лянуюцца, купляючы паўфабрыкаты або заказваючы дастаўку гатовых страў), зразумела, што наўрад ці іх дзеці ўпадабаюць вараную брокалі і замест прагляду кіно адправяцца на трэніроўку. Асабліва небяспечная адсутнасць фізічнай нагрузкі ў перыяды з 5 да 7 і з 12 да 17 гадоў, адзначаюць дыетолагі: у гэтыя ўзроставыя прамежкі арганізму ўласціва рэзкае павелічэнне масы цела. Дарэчы, парушэнне рэжыму сну таксама падвяргае ваша дзіця рызыцы набору лішняй вагі: недасыпанне правакуе выпрацоўку гармону голаду.

• Недастатковая ўвага бацькоў

Дыетолагі гавораць: большасць дзяцей і падлеткаў бацькі прыводзяць да спецыялістаў, калі вага спадчынніка ўжо набліжаецца да 90-100 кг. Калі праблема паўстае, прабачце за каламбур, ва ўсёй сваёй паўнаце. Пры гэтым медыцынская картка такога дзіцяці бывае не менш пухлай, чым яе ўладальнік. Але бацькі адмахваюцца ад слоў медыкаў, упэўненыя: іх дзіця спажывае не так і шмат калорый, ды і з фізічнай актыўнасцю ў яго ўсё ў парадку. Вырасце — пахудзее, калі захоча. Між тым нярэдка адказы на пытанні «Чаму маё дзіця часта хварэе?» і нават «Чаму дрэнна вучыцца?» можа даць дыетолаг. Бо шмат у чым гарманічнае развіццё арганізма, які расце, вызначае тое, што гэты самы арганізм здолеў узяць з ежы на пабудову сябе: амінакіслоты (падмурак з бялку), тлушчы (будматэрыял для клетак), вугляводы (чыстая энергія), вітаміны, мікра- і макраэлементы (каталізатары ўсіх абменных працэсаў у арганізме), ваду. Адсутнасць або недахоп тых ці іншых элементаў у харчаванні — і ўсе рэакцыі ў арганізме запавольваюцца: мы атрымліваем павольны абмен рэчываў, зніжэнне імунітэту і нават у шэрагу выпадкаў — праблемы з паводзінамі. Не кажучы ўжо пра нізкую самаацэнку, а часта і непапулярнасць у калектыве аднагодкаў.

ЧЫМ ПАГРАЖАЮЦЬ ЛІШНІЯ КІЛАГРАМЫ?

— Лішняя вага дзіцяці — не толькі і не столькі праблема эстэтычная, — падкрэслівае **валеолаг Лілія КАЦЕР.** — Залішняя маса цела перагружае ўсе органы і сістэмы юнага арганізма. Павялічваецца рызыка развіцця цукровага дыябету другога тыпу. А гэтае захворванне, калі развілося раней за 18 гадоў, у перспектыве скарачае працягласць жыцця. Так што бацькам важна думаць аб будучыні сына ці дачкі.

Атлусценне ў перспектыве можа стаць прычынай яшчэ шэрагу захворванняў, падкрэслівае спецыяліст. Напрыклад, мужчынскага і жаночага бясплоддзя. Моцна пакутуе пры атлусценні печань — у шэрагу выпадкаў залішняя вага прыводзіць да яе хранічнай тлушчавай дыстрафіі і гепатозу (наступная стадыя — цыроз). Калі атлусценне мае дзіця ці падлетак, то хуткі рост і фарміраванне касцяной тканкі на фоне залішняй вагі могуць прывесці да праблем з пазваночнікам і суставамі яшчэ ў дзяцінстве. Таксама атлусценне можа правакаваць апноэ, ранні атэрасклероз, павышэнне артэрыяльнага ціску, хранічныя хваробы сэрца, якія, дарэчы, сёння ў свеце маладзеюць.

У групу рызыкі па атлусценні ўваходзяць, у прыватнасці, дзеці, бацькі якіх маюць атлусценне або тыя, чые сваякі пакутуюць на цукровы дыябет (іншыя эндакрынныя паталогіі), а таксама малыя, рана пераведзеныя на штучнае харчаванне (асабліва незбалансаванымі высокакаларыйнымі сумесямі), і неданошаныя дзеці.

Паказанні для зніжэння вагі могуць быць эстэтычнымі і медыцынскімі, тлумачыць спецыяліст. Медыцынскія вызначае толькі ўрач.

— І дзіця, і яго бацькі павінны быць гатовыя да змены ладу жыцця і харчовых паводзін, — падкрэслівае Лілія Кацер.

ЯК ВЫПРАВІЦЬ СІТУАЦЫЮ

Банальна, але факт: ніколі не позна выпрацаваць здаровыя звычкі. А пачаць гэты шлях можна з некалькіх крокаў.

➢ Вазьміце за правіла харчавацца рэгулярна, у адзін і той жа час. Арганізм прызвычаіцца выпрацоўваць страўнікавы сок у вызначаныя гадзіны, і перакусаў — галоўнай крыніцы лішніх кілаграмаў — у дзіцяці ды і ў вас стане менш.

➢ Зрабіце сняданак абавязковым пунктам распарадку дня. Гэта зменшыць памер порцыі ў абед, і, што асабліва важна, вячэра будзе не такой каларыйнай. Нагадаем, апошні прыём ежы павінен завяршыцца за 3-4 гадзіны да сну. А не за паўгадзіны, «каб лепш спалася».

➢ Практыкуйце сямейныя трапезы, якія вы гатуеце «з нуля», а не заказвайце гатовыя стравы, не выкарыстоўвайце паўфабрыкаты. Акрамя таго, што хатняя ежа апрыёры больш карысная і здаровая, ёсць цікавае нядаўняе даследаванне: дзеці, якія рэгулярна не менш за 20 хвілін знаходзяцца за сталом у коле сям'і, важаць менш і маюць менш праблем са страваваннем, чым тыя, каго кормяць асобна.

➢ Выключыце падчас трапезы прагляд тэлевізара, скролінг у інтэрнэце, гульні, мультфільмы і г. д. Адкладзіце гаджэты самі і не дазваляйце дзіцяці сумяшчаць іх з прыёмам ежы. Калі чалавек заняты толькі ежай, ён хутчэй зможа ўсвядоміць, што сыты.

➢ Не прымушайце дзіця даядаць усё, што ляжыць у яго на талерцы. І заўсёды пытайце, колькі яму пакласці.

➢ Перастаньце хваліць дзіця за тое, што яно «добра есць». Напэўна, у вас знойдзецца мноства іншых прычын пахваліць малога.

➢ Прыгатуйце карысныя перакусы: маркоўныя палачкі замест чыпсаў, прысмакі правільнага харчавання замест «Снікерса», гарбузовыя семачкі замест салёных арэшкаў. Нясмачна? Толькі пытанне звычкі.

➢ Не рабіце з дэсертаў і фастфуду спосаб заахвоціць малое ці «забаронены плод» толькі для асаблівых дзён. Дзіця вырасце, і забароненае перастане для яго быць вось такім, а арэол пазітыву вакол цукерак або гамбургера застанецца.

➢ А ўвогуле, пачніце з сябе. Калі бацькі правільна сілкуюцца, выхадныя праводзяць не на канапе, а на прыродзе, наведваюць спартзалу, калі ў сям'і наладжаны рэжым ежы і сну, усё гэта будзе падхоплена і дзецьмі.

Атлусценне лягчэй прадухіліць, чым потым ад яго пазбавіцца. Так што вышэйпералічаныя парады ўніверсальныя. Пачынайце!

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Каментарый у тэму:

Марыя ЛІТВІНАВА, урач-дыетолаг:

— У пытаннях прафілактыкі і лячэння атлусцення ў дзяцей неверагодна важны бацькоўскі прыклад. Як паказвае практыка, вельмі часта падчас зваротаў да спецыяліста высвятляецца, што бацькі і самі харчуюцца няправільна. І проста не разумеюць, што яны робяць не так. Калі патрабуецца абмежаваць высокакаларыйныя прадукты ў рацыёне дзіцяці, неабходна зрабіць гэта ў цэлым у рацыёне сям'і. Такім чынам, паступова мяняючы ў бок правільнага харчавання звычкі ўсёй сям'і, мы дасягаем аздараўлення і дзіцяці, і бацькоў. І яшчэ адна заўвага. У выпадку залішняй вагі ў дзіцяці абследаванне ў эндакрынолага абавязковае. Гэтую праблему бацькам не варта лічыць малаважнай, не трэба спадзявацца, што ўсё вырашыцца «само сабой». Таму што дзіцячае атлусценне — у першую чаргу праблема не эстэтычная, а медыцынская. Гэта дыягназ. Як толькі педыятр выяўляе лішнюю вагу ў дзіцяці, ён накіроўвае яго да эндакрынолага. І вельмі важна прыйсці на прыём, выканаць усе неабходныя абследаванні і медыцынскія рэкамендацыі.

ПТУШКА... НА ШЧАСЦЕ

Драўляную птушачку можна падвесіць на кручок да столі, да жырандолі, паліцы. Галоўнае, каб вакол была прастора для руху крылаў.

Любоў да птушак і творчасці перадалася ад дзядулі.

Падчас сустрэчы Юлія распавяла натхняльную гісторыю, паводле якой любоў да птушак і да творчасці перадалася ёй у спадчыну:

— Мой дзядуля Эдуард Аляксандравіч Зубелік працаваў маляром. У Баранавічах яго добра ведалі, бо ён фарбаваў усё, што можна: фантаны, фасады... Але ў душы заўсёды быў мастаком. Падчас абедзеннага перапынку ўсе мужыкі перакурвалі, а ён даставаў аловак і блакнот. Маляваў партрэты і раздорваў. Я расла не ў кватэры, а ў сапраўднай «мастацкай галерэі». На сценах фарбамі дзядуля маляваў вялікія карціны — лебедзяў, якія ляцяць, і «Раніцу ў сасновым лесе», на шкле ў дзвярах — бярозкі. На падлозе ў вітальні метадам аплікацыі з тонка падабраных па колеры кавалкаў лінолеуму зрабіў нешта накшталт дывана. Мне ў спадчыну дастаўся сапраўдны скарб — яго старэнькі чамадан. У ім — партрэты, пейзажы, нацюрморты дзядулі. Ён наогул вельмі любіў прыроду, заўсёды знаходзіў час палюбавацца світанкамі і захадамі сонца. Я з ім праводзіла вельмі шмат часу і вельмі ўдзячна, што ён перадаў мне ўменне заўважаць прыгажосць вакол сябе. І яшчэ дзядуля вельмі любіў усё жывое. ...У яго была процьма прыкормленых катоў, сабак, ён на руку, на плячо сыпаў крошкі, каб вераб'і ды сініцы да яго прылятлі. Я перакананa, што яму вельмі спадабаліся б нашы драўляныя птушкі. Але, на жаль, у яго здарыўся інсульт. Дзядуля сышоў у найлепшы свет у 84 гады. Тым не менш я ведаю, што ён пражыў вельмі шчаслівае жыццё. Часта думаю: вось сёння людзі пастаянна штосьці шукаюць. Нам увесь час для шчасця чагосьці не хапае... Дзядуля ж умеў знаходзіць радасць у кожным моманце. Заўсёды казаў: «Вунь сонца ўстала, значыць, ёсць надзея, што ўсё будзе добра».

ПРА МАГІЮ ДЫ МУЗЫЧНУЮ КАЛОНКУ

Размаўлялі мы ў майстэрні, дзе нараджаюцца на свет крылатыя прадвеснікі шчасця. Адразу ж з парога мой погляд «узлятае» пад столь і затрымліваецца на ластаўцы, чайцы, стрыжы ды буслёку. Назіраючы за плаўнымі ўзмахамі іх крылаў, упадаеш у медытатыўны стан. У нейкі момант нават забываеш, што птушкі зроблены з дрэва, здаецца, што вось-вось яны адна за адной вылецяць з акна...

Каля васьмі гадоў таму гэтаксама, як і я, на драўляную чайку ў сувенірнай краме, бы заварожаныя, глядзелі Юля з Дзімам.

Юля: Гэта было падчас адпачынку ў Чарнагорыі. Перад ад'ездам дадому мы зайшлі ў маленечкую сувенірную краму, дзе зусім выпадкова ўбачылі падобную птушку. Дакладней, Дзіма ўбачыў. Я яе і не заўважыла б, напэўна, бо яна вісела пад самай столлю. Людзі ж рэдка ў крамах глядзяць уверх. Мы ўжо стаялі каля касы, як раптам Дзіма кажа: «Юля, глядзі!» І тузае за вяровачку. У гэты момант пачалася магія — чайка «паляцела». Мы, не раздумваючы, выклалі 30 еўра за крылаты цуд.

Дзіма: Павесілі мы яе на кухні, яна і цяпер там вісіць — як сімвал пачатку нашага творчага шляху. Я штодня любаваўся яе палётам. І мне стала цікава паспрабаваць зрабіць штосьці падобнае самому. Рукамі я працаваць звыклы, большую частку жыцця пражыў у прыватным доме, дапамагаў тату штосьці прыкруціць, адпілаваць. Сваю першую чайку я падарыў цешчы. Потым было яшчэ некалькі, усе імгненна «разляцеліся» па дамах сяброў і сваякоў. Некалькі птушак я аддаў на рэалізацыю ў сувенірныя крамы. На хобі часу не заставалася.

Юля: Так склалася, што ў 2019 годзе мужу прыйшлося на нейкі час пакінуць сваю работу. Я ж якраз пайшла ў дэкрэтны водпуск, але жаданне паказаць птушак іншым людзям не давала спакою. Мне вельмі падабаліся гэтыя душэўныя вырабы. І я прапанавала Дзіму падысці да справы сур'ёзна.

Дзіма: Менавіта тады з'явіўся наш першы шліфавальны станок, зроблены з музычнай калонкі і дрылі. Я майстраваў птушак на балконе, можна сказаць, на каленцы. Рыхтаваўся да першага ў сваім жыцці кірмашу вырабаў ручной работы. Да чайкі дадаліся стрыж і ластаўка.

Юля: І вось мы на «Млыне» — з 16 падпісчыкамі Instagram і сумненнямі, ці патрэбна камусьці тое, што мы робім. Да 31 снежня ў нас было больш як сто прададзеных птушак шчасця і 500 падпісчыкаў. «Млын» даў нам неверагодны зарад і жаданне працягваць справу. Вельмі натхніла рэакцыя наведвальнікаў. Многія спыняліся і глядзелі на нашых птушак як на нейкі цуд. Неўзабаве мы арандавалі памяшканне для майстэрні, закупілі неабходны прафесійны інструмент, каб рабіць птушак хутчэй і больш якасна. Мы не стаім на месцы, пастаянна паляпшаем вырабы. За чатыры гады замянялі адзін матэрыял на іншы, адну фарбу — на другую, пакуль птушкі не сталі надзейнымі і цалкам не задаволілі Дзіму. Бо ён перфекцыяніст — калі за штосьці бярэцца, то робіць на сумленне.

Дзіма: Калі цяпер параўнаць якасць купленай намі ў Чарнагорыі птушкі і тых, што мы робім сваімі рукамі, — гэта неба і зямля.

— Для каго вы робіце сваіх птушак?

Юля: Для людзей, якія любяць незвычайныя рэчы ў інтэр'еры, для рамантыкаў, тых, хто шукае крыху чараўніцтва, тых, хто цэніць менавіта вырабы ручной работы. Нашы птушкі па-за ўзростам і полам. Вельмі часта яны падабаюцца мужчынам, іх прыцягвае фізіка вырабу. Робяць выгляд, што купляюць для дзіцяці, але насамрэч для сябе. Нашы падвясныя птушкі дапамагаюць запаволіцца, «выключыць» шум і мітусню ў галаве.

У асноўным людзі, якія ўжо набылі адну птушку, вяртаюцца яшчэ па падарунке для блізкіх. Буслоў часта дораць паслам, купляюць для музеяў. Нядаўна прыйшло вельмі радаснае паведамленне: «Купіла восенню на «Млыне» вашага бусла. А ён да Новага года прынёс нам доўгачаканага малога. Муж сказаў: «Трэба яшчэ аднаго ў наш дом засяліць. Дзякуй за цуды!» Як я люблю такія гісторыі! Мы шчыра верым, што нашы буслы валодаюць цудадзейнай сілай, бо гэта ўжо не першы малы на рахунку нашых птушачак. Дарэчы, падвясныя птушачкі могуць служыць мабілем над дзіцячым ложачкам, які стане любімай цацкай па меры сталення дзіцяці.

ПРА РУЖОВЫЯ КРЫЛЫ ДЫ РАБОТУ Ў БАНКУ

У калекцыі сям'і Гарошкаў раней былі і ружовыя птушкі, і бірузовыя. Але з часам рамеснікі зразумелі, што людзі аддаюць перавагу класіцы.

Дзіма: Мне запомнілася, як наша ружовая чайка спадабалася сямігадоваму хлопчыку. Бацькі яго доўга адгаворвалі: «Не, гэта для дзяўчынак. Ружовая... Ну куды?» Яны ў выніку ўзялі белую птушку, але потым вярнуліся і замянілі яе на ружовую. Бацькі думаюць, што яны ўсё ведаюць лепш. Так, магчыма. Але часам трэба дазволіць дзіцяці самому зрабіць выбар. Інакш яно так і не даведаецца, што яму сапраўды падабаецца ў гэтым жыцці. Магчыма, зразумее, гадоў у сорак. Але ж, пагадзіцеся, далёка не кожны ў такім узросце вырашыць кардынальна ўсё памяняць, каб пайсці па новым шляху.

— Раней рамяство перадавалася ад бацькі сыну. Вам бы хацелася, каб сын, калі падрасце, таксама далучыўся да сямейнай справы?

Дзіма: Я хачу, каб ён паспрабаваў рознае і выбраў тое, што яму па душы. Мая мама ўсё жыццё працавала ў банку. Таму нават пытанняне стаяла, на каго мне пайсці вучыцца. Я атрымаў эканамічную адукацыю, бо ўсе казалі, што яна перспектыўная. Цяпер разумею, што гэта ну зусім не маё, мне падабаецца штосьці рабіць рукамі, працаваць з дрэвам. Але ў той час я паддаўся ўплыву старэйшых. І страціў шмат гадоў свайго жыцця на работу, да якой не ляжала душа.

Юля: Нашаму сыну пяць гадоў. І мяне вельмі радуе, што Ваня расце ў творчай атмасферы, прыходзіць у майстэрню, з самага дзяцінства штосьці спрабуе пілаваць, ужо ўмее абыходзіцца са шрубакрутам. Птушкай, якая лётае, яго, вядома, ужо не здзівіць. Яму цікавей назіраць, як яны робяцца, які інструмент для чаго прымяняецца. Мне падабаецца, што ён знаходзіцца ў творчым асяродку, стаіць з намі на выстаўках. Гэта, спадзяюся, дасць яму магчымасць у будучыні развіць творчыя здольнасці. Бо, я перакананa, творчасць вельмі важная ў жыцці любога чалавека. Яна дапамагае зразумець, на што здольная твая душа. Тварыць жа можна дзе заўгодна, нават працуючы кантралёрам у аўтобусе.

ПРА СТАРЭНЬКІ ЧАМАДАН ДЫ ПРОСТУЮ РАДАСЦЬ

— Ці складана разам займацца адной справай?

Дзіма: Зрабіць выраб — гэта толькі палова справы. Не менш важна — яго прадаць. Адзін, без жонкі — яна маркетолаг па адукацыі, — я дакладна не справіўся б. Відаць, даўно б ужо кінуў.

Юля: Добра, што ў нашай сямейнай справе ёсць і мужчынскі, і жаночы пачатак. Мы ўзаемадапаўняем адно аднаго, у нас у гэтым плане ўдалы тандэм. Калі ў аднаго рукі апусціліся, другі яго натхняе і штурхае наперад.

Дзіма: Я зразумеў, што важна ісці сваім шляхам, арыентавацца ў першую чаргу на сябе, на свае ўнутраныя адчуванні, інтуіцыю. І тады абавязкова ўсё атрымаецца. Можа, не з першага разу, але, жыццё паказвае, менавіта цяжкасці загартоўваюць, робяць цябе мацнейшым.

Юля: Я веру, што ўсё ў жыцці невыпадкова. У гэтым свеце дакладна ёсць нешта большае, чым бачаць нашы вочы. Такое адчуванне, што гэту справу нам з Дзімам Бог даручыў не проста так, што мы выконваем светлую місію — натхняць і прыносіць людзям радасць.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.
Фота з архіва герояў артыкула.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Вилейский райагросервис»

Лот	Наименование	Земельный участок и местонахождение лота	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Капитальное строение с инвентарным номером 631/С-60154 (назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – жилой дом, площадь – 61,3 кв. м). Составные части и принадлежности: одноэтажный блочный облицованный кирпичом жилой дом с двумя пристройками, сараем, навесом	Земельный участок с кадастровым номером 621384604101000100, для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома), пл. – 0,0965 га (право аренды), расположенный по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, Любанский с/с, д. Журихи, ул. Молодежная, 3б	12048,00	1204,80	602,40
2	Капитальное строение с инвентарным номером 631/С-60112 (назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – жилой дом, площадь – 62,5 кв. м). Составные части и принадлежности: одноэтажный блочный облицованный кирпичом жилой дом с холодной пристройкой, сараем, навесом	Земельный участок с кадастровым номером 621384604101000091, для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома), пл. – 0,0597 га (право аренды), расположенный по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, Любанский с/с, д. Журихи, ул. Центральная, 47	15408,00	1540,80	770,40
3	Капитальное строение с инвентарным номером 631/С-60062 (назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – жилой дом, площадь – 61,9 кв. м). Составные части и принадлежности: одноэтажный блочный облицованный кирпичом жилой дом с тамбуром, сараем	Земельный участок с кадастровым номером 621384604101000092, для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома), пл. – 0,0587 га (право аренды), расположенный по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, Любанский с/с, д. Журихи, ул. Центральная, 49	15216,00	1521,60	760,80
4	Капитальное строение с инвентарным номером 631/С-60064 (назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – жилой дом, площадь – 61,8 кв. м). Составные части и принадлежности: одноэтажный блочный облицованный кирпичом жилой дом с тамбуром, сараем, навесом	Земельный участок с кадастровым номером 621384604101000094, для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома), пл. – 0,1212 га (право аренды), расположенный по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, Любанский с/с, д. Журихи, ул. Центральная, 57А	15216,00	1521,60	760,80
5	Капитальное строение (жилой дом) с инвентарным номером 631/С-60157 (назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – жилой дом, площадь – 61,8 кв. м). Составные части и принадлежности: одноэтажный блочный облицованный кирпичом жилой дом с двумя пристройками, сараем, навесом	Земельный участок с кадастровым номером 621384604101000098, для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома), пл. – 0,0985 га (право аренды), расположенный по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, Любанский с/с, д. Журихи, ул. Молодежная, 8А	15216,00	1521,60	760,80
6	Капитальное строение (жилой дом) с инвентарным номером 631/С-60155 (назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – жилой дом, площадь – 61,1 кв. м). Составные части и принадлежности: одноэтажный блочный облицованный кирпичом жилой дом с двумя пристройками, сараем, навесом	Земельный участок с кадастровым номером 621384604101000099, для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома), пл. – 0,1402 га (право аренды), расположенный по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, Любанский с/с, д. Журихи, ул. Молодежная, 10А	15168,00	1516,80	758,40
7	Капитальное строение (жилой дом) с инвентарным номером 631/С-60066 (назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – жилой дом, площадь – 72,0 кв. м). Составные части и принадлежности: одноэтажный блочный оштукатуренный жилой дом с верандой, 1/2 сарая	Земельный участок с кадастровым номером 621384604101000097, для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома), пл. – 0,1014 га (право аренды), расположенный по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, Любанский с/с, д. Журихи, ул. Молодежная, 6А	17040,00	1704,00	852,00
8	Капитальное строение (жилой дом) с инвентарным номером 631/С-59395, (назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – жилой дом, площадь – 77,9 кв. м). Составные части и принадлежности: одноэтажный блочный оштукатуренный жилой дом с пристройкой, сараем	Земельный участок с кадастровым номером 621385408101000157, для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома), пл. – 0,1537 га (право аренды), расположенный по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, Осиповичский с/с, д. Осиповичи, ул. Центральная, 84	19056,00	1905,60	952,80

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
9	КЗС-25 Осиповичи, инв. № 6052-ОС	9000,00	900,00	450,00
10	Бункер зерновой, инв. № 6050-ОС	676,80	67,68	33,84
11	КЗС-25 (раукомпл.), инв. № 6051-ОС	4392,00	439,20	219,60
12	Трактор МТЗ 1523В гос. № 68-46ОА-5, инв. № 416	9504,00	950,40	475,20
13	Бытовка (метал.), инв. № 6057-ос1	675,00	67,50	33,75
14	Вагончик 6,7 *3 м, инв. № 6058-ос1	3960,00	396,00	198,00

В отношении лотов №№ 1–8 проводятся пятые повторные торги. **Стоимость снижена на 60 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 208 (30088) от 26.10.2023, стр. 10, № 239 (300969) от 09.12.2023, стр. 14, № 6 (300990) от 10.01.2024, стр. 15, № 22 (301006) от 01.02.2024, стр. 15, № 36 (3010190) от 21.02.2024, стр. 14. В отношении лотов №№ 9–12 проводятся третьи повторные торги. **Стоимость снижена на 40 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 228 (300958) от 24.11.2023, стр. 15, № 22 (301006) от 01.02.2024, стр. 15, № 36 (3010190) от 21.02.2024, стр. 14. В отношении лотов №№ 13, 14 проводятся вторые повторные торги. **Стоимость снижена на 25 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 228 (300958) от 24.11.2023, стр. 15, № 36 (3010190) от 21.02.2024, стр. 14

Местонахождение лотов №№ 9–14: Минская обл., Вилейский р-н

Дата и время проведения торгов	**20 марта 2024 года в 12.00 (регистрация – с 11.30 до 11.55)**
Срок приема заявлений и внесения суммы задатка	**с 10.00 7 марта 2024 года до 16.00 18 марта 2024 года**
Ограничения (обременения)	Лоты №№ 3–8 имеют обременения в виде заключенных договоров найма жилых домов (помещений). В отношении лотов №№ 1–8 имеется ограничение (обременение) в виде залога (залогодержатель – ОАО «Белагропромбанк»). Залог прекращается в случае реализации объекта на торгах (ст. 333 ГК РБ). Лот № 14 имеет обременение в виде заключенного договора аренды. Вопросы по обременениям по тел. 80172552928

Условия для участия в торгах:

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA301222155700 40270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ОАО «Вилейский райагросервис», проводимых 20.03.2024.

2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления являются дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

